


# «ГЭТА НАША ШКОЛА, ТРЭБА ГЭТУ ШКОЛУ РАЗВІВАЦЬ»

**Прэзідэнт наведаў вытворчасць, прадукцыя якой патрэбна ўсім**

(Працяг на стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 ЧЭРВЕНЯ 2025 г. АЎТОРАК № 115 (30503)



# «ПЛАНУЮ ЖЫЦЬ І ПРАЦАВАЦЬ У СВАЁЙ РОДНАЙ КРАІНЕ»

**Сёлета беларускія школы выпусцілі з-пад свайго крыла больш за 56 тысяч адзінаццацікласнікаў**

У гэты дзень роўна ў восем гадзін вечара ва ўсіх кутках краіны прагучаў Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь, яго выконвалі галоўныя героі свята — выпускнікі 2025 года разам з настаўнікамі, роднымі і сябрамі. Эмоцыі маладых людзей немагчыма апісаць словамі. Гэта трэба было бачыць — колькі святла, радасці і гонару на тварах учарашніх школьнікаў! Яны спявалі ад душы. Спявала душа і ў педагогаў — значыць, у выхаванні дзяцей яны не прапусцілі самага галоўнага: навучыць іх быць сапраўднымі грамадзянамі і патрыётамі сваёй краіны.

СТАР. 8–9

Фота БелТА.



МАЛАДЫЯ ЛІДАРЫ МІНШЧЫНЫ. ХТО ЁСЦЬ ХТО?

8–9



НА ЗАВОД УСЁЙ... РАДНЁЙ

10

# СВЯТОЧНЫ РЫТМ МАЛАДЗЕЧНА




**Чым здзіўляў і радаваў XXIV Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі**

Светлай радасцю, лірычным настроем і атмасферай сапраўднага адзінства быў насычаны апошні тыдзень маладзечанцаў. Штогадовы Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі, які праводзіцца з 1993 года, зноў аб'яднаў сотні людзей, якія неабыякавыя да мілагучнага беларускага слова. Як адзначыў у сваім прывітанні ўдзельнікам і гасцям свята Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, за гады свайго існавання фестываль стаў знакавай падзеяй у культурным жыцці краіны і заваяваў павагу шматлікіх прыхільнікаў. «Праграма гэтага года прысвечана 80-годдзю Вялікай Перамогі, што надае святочным мерапрыемствам асаблівую актуальнасць. Вечныя тэмы грамадзянскага міру і згоды, любові да Радзімы стануць духоўным пасланнем і сімвалам фестывалю», — згадаў у прывітальным слове кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 13

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!




Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2025 года

Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ISSN 1990 — 763X

# «ГЭТА НАША ШКОЛА,

## Прэзідэнт наведаў вытворчасць,

Субота ў графіку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі была рабочай. Кіраўнік дзяржавы працаваў у Гродзенскай вобласці, а дакладней, у Ваўкавыску на ААТ «Беллакт». Па традыцыі рэгіянальных камандзіровак, беларускі лідар глядзіць шырэй — на развіццё ўсяго рэгіёна.



### У ЧЫМ ТРЭБА ПАДЦЯГНУЦЦА ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Так было і гэтым разам — кіраўнік дзяржавы з верталёта агледзеў сітуацыю на палях Гродзеншчыны. Першае пытанне да старшыні аблвыканкама Юрыя Караева было адпаведным: што пасеяна, як праводзіцца рэкультывацыя? Юрый Караеў далажыў, што пасеялі ўсё, недзе прыйшлося і перасейваць. Аляксандр Лукашэнка застаўся незадаволеным сітуацыяй на палях у раёне камандзіроўкі. «Я табе скажу: думаў, што ў Ваўкавыскім раёне значна лепш...» — заўважыў ён. Але кіраўнік вобласці запэўніў, што лепш будзе.

Прэзідэнту таксама далажылі аб сацыяльна-эканамічным развіцці Гродзенскай вобласці. Валавы рэгіянальны прадукт Гродзеншчыны вышэйшы за леташнія паказчыкі, але ўсё роўна не дацягвае да запланаваных. Юрый Караеў растлумачыў, што сельская гаспадарка, будаўніцтва і гандаль дадаюць, ёсць некаторыя праблемы з прамысловасцю. Разам з тым намінальная налічаная сярэднямесячная зарплата ў вобласці, інвестыцыі ў асноўны капітал растуць апераджальнымі тэмпамі.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў асаблівую ўвагу на сітуацыю ў паўночных раёнах Гродзенскай вобласці, якія «трэба падцягваць». Абмеркавалі і рэалізацыю праграмы «Адзін раён — адзін праект». На Гродзеншчыне цяпер рэалізуецца 25 праектаў у рамках згаданай праграмы. Яшчэ адно актуальнае для ўсіх рэгіёнаў пытанне — сельгастэхніка, сельгасхімія і райснабы. «Вы імі займаецеся? У кожным раёне яны адноўлены? Вы бачылі, што трэба зрабіць, ведаеце, як трэба аднаўляць? Трэба, каб мы дакладна разумелі, што мы там будзем рабіць», — адзначыў Прэзідэнт, зрабіўшы акцэнт на тым, што ў гэтым кірунку яшчэ шмат работы.

Кіраўніка дзяржавы праінфармавалі аб сітуацыі ў Ваўкавыскім раёне. Адна з асноўных праблем раёна — зніжэнне вытворчасці ялавічыны і свініны. Прычыны гэтых праблем вядомыя, і яны вырашаюцца, спосабы вырашэння таксама вядомыя. Напрыклад, на Ваўкавышчыне не хапае пагалоўя буйной рагатай жывёлы для вытворчасці ялавічыны. Варта адзначыць, што падзеж жывёлы тут знізіўся. Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да віцэ-прэм'ера Юрыя Шулейкі, які курыруе сельскую гаспадарку, і нагадаў, што трэба сачыць за тым, каб жывёлу з няўдалых гаспадарак, дзе яе не могуць утрымліваць, перадавалі ў нармальныя гаспадаркі. Можна нават не аддаваць, а прадаваць. «Барані бог я вам зраблю заўвагу, што ў вас дзесьці падзеж, а як у яго ёсць вольныя месцы для адкорму, ужо я вам галовы паздымаю дакладна! — папярэдзіў Прэзідэнт. — За жывёлу адкажаце. Забралі — і адвезлі ў добрую гаспадарку, няхай адкормліваюць. Там, напэўна, наогул не будзе падзяжу». Перад губернатарам пастаўлена задача — увесці армейскі парадак на свінакомплексах, каб там стапрацэнтна выконвалася тэхналагічная дысцыпліна.

Кіраўнік дзяржавы асобна пацікавіўся, як у рэгіёне складваецца справа з бульбай. Па даручэнні Прэзідэнта кантралюючыя органы аператыўна вывучылі сітуацыю на месцах — праблем выяўлена не было. Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю, упаўнаважаны Прэзідэнта па Гродзенскай вобласці Васіль Герасімаў падкрэсліў, што рэгіён свае абавязацельствы па стабілізацыйных фондах у мінулым годзе выканаў. Дзякуючы гэтаму насельніцтва не адчула дэфіцыту бульбы, яна нават пастаўлялася ў гандлёвых сетках, у якіх узніклі падобныя пытанні. Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу прыняць адпаведныя меры, каб у будучым годзе не было такіх праблем. «Колькі трэба — у рэзерв, у сябе трымаеце, але каб хапала. Я разумею, вядома, у Расіі ў 2-3 разы даражэйшая была бульба. Хтосьці ж хоча зарабіць — сяляне вывозілі, фермеры вывозілі, з аднаго боку. Ну а з другога боку, нейкі там дзесьці выявілі сабатаж», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён таксама заўважыў, што вялікіх праблем з бульбай не назіраецца, тым больш ужо з'явіўся ўраджай гэтага года.

### ЦІ МОЖАМ ПАГЛЫБІЦЦА?

Даклад аб рабоце ААТ «Беллакт» Прэзідэнт заслухаў непасрэдна ў цэхах таварыства. ААТ «Беллакт» — адзінае прадпрыемства ў Беларусі па вытворчасці сухіх малочных сумесяў і каш для харчавання дзяцей з першых дзён жыцця, да года і далей. З 2014 года пад маркай «Беллакт» выпрабляюцца вадкае і пастападобнае дзіцячае харчаванне. З лістапада 2018 года асвоены выпуск сухіх каш для харчавання дзяцей ранняга ўзросту на казіным малаку. Таксама ААТ «Беллакт» выпрабляе сухое цэльнае і абястлушчанае малако, сухую сыроватку, масла, шырокі асартымент натуральнамалочнай і дэсертнай прадукцыі. Асартымент налічвае больш за 200 найменняў. Магутнасць па перапрацоўцы малака складае 865 т у суткі. За студзень — красавік 2025 года загрузка вытворчасці склала 95,5 %. За гэты ж прамежак часу на вытворчых пляцоўках прадпрыемства выраблена прадукцыі ў фактычных цэнах на 204,3 мільёна рублёў, гэта амаль на 12 % больш, чым у аналагічным перыядзе за 2024 год. Свае тавары прадпрыемства экспартуе ў 19 краін.

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з вытворчай базай таварыства, наведаў участак расфасоўкі дзіцячага харчавання і азнаёміўся з асартыментам прадукцыі. У найбліжэйшы час на заводзе запрацуе новая лінія разліву малочкі ў ПЭТ-бутэлькі, што дазволіць максімальна пашырыць асартымент. Гэта новы цэх, дзе будуць перапрацоўваць 100 т малака за суткі.

Дарэчы, візіт Прэзідэнта дзейнасць ААТ «Беллакт» не спыніў — работа тут кіпіць і па выхадных. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, чаму па краіне не ствараецца больш такіх прадпрыемстваў па вытворчасці дзіцячага харчавання, калі гэтыя тавары карыстаюцца попытам не толькі на ўнутраным, але і на знешнім рынках. Па тэхніцы гэта рэальна, але ёсць праблемы са спецыялістамі — іх вельмі мала, гэта ўнікальныя людзі. І далёка не ўсе прафесіяналы з малочнаперапрацоўчай галіны могуць выпрабляць дзіцячае харчаванне. «Гэта наша школа, трэба





# ТРЭБА ГЭТУ ШКОЛУ РАЗВІВАЦЬ»

## прадукцыя якой патрэбна ўсім

гэту школу развіваць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Тым больш, сыравіны ў краіне хапае. Дарэчы, сыравінная зона «Беллакта» прадстаўлена чатырма раёнамі Гродзенскай вобласці і складаецца з 24 сельскагаспадарчых арганізацый. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што трэба імкнуцца да таго, каб выкарыстоўваць сыравіну поўнасцю з Гродзеншчыны і не залежаць ад іншых рэгіёнаў.

Яшчэ адзін важны аспект, які датычыцца дзіцячага харчавання, — рэкамендацыі дактароў. Як правіла, маці выбіраюць для дзяцей тую ежу, якую рэкамендуюць медыкі. «Вазьміце з гродзенскімі дактарамі стварыце групу, на ўсю краіну сертыфікуйце, каб больш ніхто нічога не рэкамендаваў і не ўмешваўся. То-бок суб'ектыўны фактар прыбярыце», — параіў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, кампаніі трэба вырашыць гэта пытанне з медыкамі з дзяржаўных пазіцый.

### «ЛЮБАЯ КРАІНА ПАВІННА НАКАРМІЦЬ СВАІХ ЛЮДЗЕЙ, ДЗЯЦЕЙ ТЫМ БОЛЬШ»

Цяпер на ААТ «Беллакт» плануюць пабудаваць дадатковую вытворчасць сухога дзіцячага харчавання. Планы своечасовыя — прадукцыя шырока запатрабаваная не толькі ў Беларусі, але і за мяжой. Пабудаваць новы цэх задумана за кошт розных крыніц. Амаль палова з іх — крэдыт Банка развіцця Беларусі. Астатняя частка — сродкі рэспубліканскага цэнтралізаванага інавацыйнага фонду, сродкі інавацыйнага фонду Гродзенскага аблвыканкама і 13 % — уласныя сродкі вытворцы. Рэалізацыя праекта дасць магчымасць дадаткова перапрацаваць 61 тысячу т малака ў год, павялічыўшы да 15 тысяч т (рост у 2 разы) вытворчасць сухіх дзіцячых сумесяў, якія адпавядаюць патрабаванням сусветных стандартаў, і пашырыўшы геаграфію экспарту ў краіны Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі.

Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся, што планы добрыя, новы цэх патрэбны, паколькі дзіцячае харчаванне цэніцца ўсюды. У прыклад ён прывёў краіны Афрыкі, дзе цяпер вельмі запатрабавана дзіцячае харчаванне беларускай вытворчасці. Накont крэдытаў Прэзідэнт папярэдзіў, што галоўная ўмова — вяртанне сродкаў, незалежна ад таго, дзе ўзяты крэдыт.

**«Калі ёсць сыравіна, ёсць рынак збыту і ён маржынальны, усё, што пазычыш, — вернеш. Будзем не проста размову па гэтай тэме весці, будзем праект падтрымліваць. Мы гэта ўмеем рабіць. І гэта сёння прадаецца. Хочаш — не хочаш, любая краіна павінна накарміць сваіх людзей, дзяцей тым больш. Будзе збыт. Мы ўмеем гэта рабіць — давайце рабіць», — адзначыў Прэзідэнт.**

Ён даручыў, не зацягваючы, без праматруджвання рыхтаваць эканамічнае абгрунтаванне праекта. «Калі трэба, будзем будаваць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнту прадэманстравалі тавары малакаперапрацоўчых прадпрыемстваў Гродзенскай вобласці, сярод якіх «Беллакт», ААТ «Лідскі малочна-кансервавы камбінат», ААТ «Малочны Мір». За стварэнне дзіцячай малочнай прадукцыі і асартымент прадукцыі «Беллакта» адказвае галоўны тэхнолаг Таццяна Новікава, якая ўжо 40 гадоў працуе на прадпрыемстве. Яна прадставіла кіраўніку дзяржавы самыя яркія віды вырабаў. «Наш гонар — гэта дзіцячае пастападобнае харчаванне. У ім практычна няма цукру. І мы сваіх дзяцей ужо тры гады прывучаем да несалодкіх прадуктаў. Ёсць лінейка дашкольнага і школьнага харчавання, гэта ніша цяпер пустая ў нашай краіне. Мы зрабілі замену «смачным» дэсертам», — расказала яна.

На памяць аб наведванні кампаніі кіраўніку дзяржавы падарылі скульптуру жанчыны, якая корміць дзіця. Такая скульптура ўстаноўлена перад цэнтральным уваходам на «Беллакт». «Не было б жанчын, не было б і жыцця на зямлі», — заўважыў Прэзідэнт. Ён распарадзіўся размясціць гэту скульптуру ў Палацы Незалежнасці.

### «НЕ ДАЗВАЛЯЙЦЕ ЗДЗЕКАВАЦЦА»

На развітанне кіраўнік дзяржавы падняў яшчэ адно пытанне, хоць і не па тэме мерапрыемства, але надзённае. Ён узгадаў нядаўні факт здзекаў з сабакі ў Гродна. Юрый Караеў расказаў, што міліцыя знайшла злачынцу. Аляксандр Лукашэнка дaручыў забраць сабаку і ўладкаваць у добрыя рукі. Ён нагадаў, што некалі сам такім жа чынам выратаваў жывёлу і падарыў шчанюка трэнеру хакейнай каманды Дзмітрыю Баскаву. Цяпер сабака — паўнавартасны член сям'і. «Не дазваляйце здзекавацца. Самыя безабаронныя — гэта жывёлы, таму што яны ад нас абараніцца не могуць. Мы можам. Яны не могуць. Таму іх трэба берагчы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

## Даслоўна

### ПОПЫТ НА ДЗІЦЯЧАЕ ХАРЧАВАННЕ БЫЎ, ЁСЦЬ І БУДЗЕ

Як распавёў журналістам **генеральны дырэктар ААТ «Беллакт» Віталь ЛУПІК,** новая вытворчасць дазволіць пашырыць геаграфію экспарту на 15 краін. Цяперашнія магутнасці не дазваляюць павялічваць аб'ём перапрацоўкі. «Мы на працягу апошняга года думалі над тым, як перапрацоўваць малако ў найбліжэйшыя гады, як перапрацоўваць яго і прадаваць максімальна маржынальна. Наша спецыфіка — гэта дзіцячае харчаванне. Адпаведна, плануем будаваць завод, які будзе вырабляць дзіцячага харчавання ў два разы больш», — адзначыў Віталь Лупік. Плануецца, што з уводам новай вытворчасці магутнасці прадпрыемства вырастуць у два разы: з 7 да 15 тысяч тон дзіцячага харчавання за год. «Патрэба ёсць. На дзіцячае харчаванне попыт быў, ёсць і будзе», — рэзюмаваў Віталь Лупік.

«Кіраўнік дзяржавы, наведваючы перспектыўны аб'ект, думае стратэгічна за ўсю краіну, за ўсю галіну. І таму ён звярнуў увагу, што наведвае аб'ект, на якім вырабляецца высокамаржынальная прадукцыя, якая прадаецца з вельмі высокай рэнтабельнасцю. Шмат сырных заводаў, шмат маслазаводаў, а па дзіцячым харчаванні ў нас такі адзін. Яго глыбокая мадэрнізацыя тактычнага ўзроўню, якую правялі сёлета, дазволіць пранікнуць у некалькі краін свету. А гэта ўсяго толькі новая ўпакоўка», — звярнуў увагу **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Юрый КАРАЕЎ.** Ён падкрэсліў, што новая вытворчасць будзе пабудавана па стандарце GMP. Гэта міжнародны стандарт, які ўстанаўлівае патрабаванні да вытворчасці і кантролю якасці на розных прадпрыемствах. Юрый Караеў адзначыў, што гэта дазволіць вырашыць пытанне празмернасці аб'ёмаў малака і дасць магчымасць прадпрыемству замацавацца ў краінах Лацінскай Амерыкі, Афрыкі і Азіі. «Кіраўнік дзяржавы бачыць, што за гэтым будучыня і што гэта рабіць трэба было яшчэ ўчора, — падкрэсліў губернатар. — І па структуры фінансавання. Прэзідэнт звярнуў увагу, што гэта ўсё дзяржаўныя грошы, з якіх бы крыніц яны ні былі. Іх трэба будзе адпрацоўваць і аддаваць».

### ІНВЕСТПРАЕКТЫ РАЗВІВАЮЦЬ РАЁНЫ

Журналісты пацікавіліся, якую аддачу адчувае Гродзенская вобласць ад рэалізацыі 25 інвестыцыйных праектаў у рамках праграмы «Адзін раён — адзін праект» і як наогул увасабляецца ў жыццё гэта праграма. «Дзесьці добра. Для невялікага раёна 123 працоўныя месцы — гэта мы ўжо нават сутыкаемся з іншай крайнасцю: а дзе ўзяць працоўныя рэсурсы? Напрыклад, у тую ж Свіслач людзі ездзяць з Ваўкавыска», — распавёў Юрый Караеў. Ён звярнуў увагу, што з ростам заработнай платы развіваецца і сфера паслуг, якая таксама дае новыя працоўныя месцы. Губернатар прывёў прыклад: «У Іўеўскім раёне ў вёсках зрабілі невялікія швейныя вытворчасці. Жанчыны, якія сядзелі дома (гэта былі не даяркі, не спецыялісты сельскай гаспадаркі, а менавіта хатнія гаспадыні), прыйшлі швачкамі на гэта прадпрыемства. Яны атрымліваюць не вельмі вялікія грошы, але яны ўжо пры справе, і гэта лепш, чым калі б яны сядзелі дома». Па словах старшыні аблвыканкама, праекты розныя. У асноўным гэта прыватнікі, вынаходлівыя, гнуткія, захопленыя, якія хочуць зарабіць. «Нам добра: няхай яны гэтыя працоўныя месцы арганізуюць. Нашы людзі будуць атрымліваць грошы, плаціць падаткі, насіць гэтыя грошы ў крамы», — заўважыў ён.

Юрый Караеў падкрэсліў, што не ўсе праекты выстрэльваюць. «Тут галоўны — старшыня райвыканкама, які стварае мікраінвестыцыйны клімат. Калі да яго прыходзіць які-небудзь інвестар і думае: «Вось ён мяне будзе падтрымліваць. Вось ён мяне абароніць ад нейкіх непаразуменняў». Вядома, не ад праваахоўных органаў — усе павінны працаваць сумленна і празрыста. Гэта значыць, інвестарам вельмі важна, каб раённая ўлада да іх ставілася лаяльна і паказвала сваю зацікаўленасць. Бо грамадзяне працуюць тут, засталіся сем'і тут, дзеці ходзяць у школу тут і звязваюць сваё жыццё са сваёй малой радзімай», — падсумаваў Юрый Караеў.

**Валерыя СЦЯЦКО. Фота БелТА.**
*г. Ваўкавыск.*





Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 2, УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «БЕЛХИМ», Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский с/с, 19. УНП 100122846 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф.1. Адрес ЭТП: **www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Экструзионная линия модели «FCL 21/SH PROCAST»,** для производства стреч пленки (эктструдер в сборе) Dolce, 2004 г.в., инв. № нф00028. Месторасположения: Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский с/с, 19 | |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 1 487 400,00 бел. руб.** Шаг торгов – 5 % от начальной цены | |
| **Задаток 5 % от начальной цены** перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 30 календарных дней** после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** 100 % оплата стоимости в течение **10 календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (раздел «Документы» www.ipmtorgi.by). Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену | |
| Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **0,8 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 21.07.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 18.07.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** | |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ
ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «АСБ Лизинг» (филиал «АСБ Логистик»), 202128, Минская область, Воложинский район, аг. Раков, ул. Радошковичская, 77. УНП 601082389 |
| **Предмет электронных торгов:** | |
| **Платная автостоянка № 4** (Сооружение многофункциональное), инв. № 600/С-140105, общ. пл. 15 460,0 кв. м, по адресу: Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район аг. Озерцо. ***Сведения о земельном участке:*** общ. пл. 1,9656 га, предоставлен продавцу для обслуживания платной автостоянки № 4 на праве аренды по 23.06.2046 | |
| **Начальная цена, с НДС 20 % – 1 755 000,00 бел. руб. Шаг торгов – 5 % от начальной цены** | |
| **Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов | |
| **Срок оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата полной стоимости объекта должна быть произведена в течение **10 (десяти) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **2 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия | |
| Извещение о проведении предыдущих электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 10.05.2025 г. | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 02.07.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **01.07.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |


САЮЗНАЯ ДЗЯРЖАВА

# РАЗАМ АБАРАНІЦЬ ПАМЯЦЬ

## На сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі ўтворана новая камісія, прынятая заява па пытаннях абароны гістарычнай праўды і захавання гістарычнай памяці

Шэсцьдзясят восьмая сесія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі прайшла ў Брэсце. Парадак дня ў асноўным склалі пытанні, звязаныя з рэалізацыяй даручэнняў, якія далі кіраўнікі дзяржаў у ходзе правядзення міжнароднага форуму Саюзнай дзяржавы «Вялікая спадчына — агульная будучыня» ў красавіку ў Валгаградзе. Прынята рашэнне зрабіць названы форум традыцыйным.



### «МЫ ЖЫВЁМ ПА ЗАКОНАХ, ПА ПРАЎДЗЕ»

**Першы намеснік старшыні Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА** звярнуўся ў сваім выступленні найперш да вынікаў Міжнароднага форуму ў Валгаградзе: «Форум паказаў, што традыцыйныя агульначалавечыя каштоўнасці падтрымліваюць і падзяляюць многія замежныя партнёры. Лік іх расце, і гэта мы бачылі ў Валгаградзе. Нам ёсць што сказаць адно аднаму, ёсць чым падзяліцца». Ігар Сергяенка агучыў прапанову зрабіць форум традыцыйным: наступны правесці ў 2026 годзе ў Беларусі і прысвяціць 85-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Паводле слоў намесніка старшыні Парламенцкага сходу, 68-ю сесію ў Брэсце можна разглядаць як лагічны працяг форуму ў Валгаградзе. «Гераічная абарона Брэсцкай крэпасці стала фактычна пачаткам шляху да Перамогі, прадэманстравала сілу духу савецкага воіна і паказала, якімі неймавернымі намаганнямі далася Перамога. Таму абавязак кожнага з нас не толькі на словах, але і справамі паказваць, што мы з'яўляемся прадаўжальнікамі традыцый пакалення пераможцаў», — падкрэсліў Ігар Сергяенка.

Ён выказаў упэўненасць, што намаганні Парламенцкага сходу па захаванні гістарычнай памяці будуць накіраваны на ўмацаванне сувязяў паміж пакаленнямі, недапушчэнне расслаення грамадства, абарону духоўных каштоўнасцяў. «Асаблівы шлях нашых краін заключаецца яшчэ і ў тым, што мы жывём па законах, па праўдзе, а не па двайных стандартах і надуманых правілах. Разам мы даказалі, што можам скаардынаваць свае дзеянні і супрацьдзейнічаць знешняму ціску», — заявіў першы намеснік старшыні Парламенцкага сходу.

### ТРЭБА ПРАЦАВАЦЬ З МОЛАДДЗЮ

Сесія ў Брэсце стала трэцім форумам, які праходзіў у горадзе над Бугам. На гэтым факце акцэнтаваў увагу **старшыня Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, старшыня Дзяржаўнай Думы Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Вячаслаў ВАЛОДЗІН.** Ён падкрэсліў сімвалічнасць месца правядзення сесіі ў 80-ю гадавіну Вялікай Перамогі. «Абарона Брэсцкай крэпасці назаўсёды ўвайшла ў гісторыю як сімвал мужнасці, гераізму, адвагі і стойкасці савецкіх салдат і афіцэраў. Каля сцен Брэсцкай крэпасці пачалася адна з самых цяжкіх старонак нашай агульнай гісторыі», — сказаў спікер. Ён таксама падзяліўся ўражаннямі ад Рэспубліканскага цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі, які дэпутаты наведалі напярэдадні.

Вячаслаў Валодзін назваў вельмі правільным рашэннем размясціць гэты патрыятычны лагер для падлеткаў менавіта на тэрыторыі крэпасці: «Тут яны змогуць не толькі прайсці аздараўленне, атрымаць фізічную загартоўку, але і дакрануцца да жывой гісторыі, многае зразумець, зрабіць правільныя высновы. Мы будзем прапрацоўваць пытанне, каб у патрыятычны цэнтр у Брэсце разам з беларускімі школьнікамі прыязджалі і іх расійскія равеснікі», — паведаміў старшыня Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. У святле прыярытэту — абароны гістарычнай памяці — падкрэслівалася неабходнасць падтрымкі маладзёжных арганізацый і рухаў для таго, каб маладыя людзі раслі сапраўднымі грамадзянамі Беларускай і Расійскай дзяржаў, Саюзнай дзяржавы.

Канкрэтнымі мерамі па ўмацаванні супрацоўніцтва Беларусі і Расіі названыя, у прыватнасці, падпісанне кіраўнікамі дзяржаў Дагавора аб гарантыях бяспекі і зацвярджэнне Канцэпцыі бяспекі Саюзнай дзяржавы. Прынятая праграма ўзгодненых дзеянняў у галіне знешняй палітыкі дзяржаў — удзельніц Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2024—2026 гады і сумеснае бачанне Еўразійскай хартыі шматаблічча і шматпалярнасці ў XXI стагоддзі.

### ЭКСПЕРТЫ, ГІСТОРЫКІ, ПАРЛАМЕНТАРЫІ

У ходзе работы сесіі прынята рашэнне аб стварэнні камісіі па захаванні і абароне гістарычнай памяці. Адзначана, што праблематыка новай камісіі Парламенцкага сходу важная і шматгранная. Да работы камісіі будуць прыцягнуты эксперты, гісторыкі, грамадскія дзеячы дзвюх краін, прадстаўнікі маладзёжных арганізацый. Камісія заклікана стаць цэнтрам прыкладання намаганняў усіх патрыятычна настроеных сіл у Саюзнай дзяржаве. Сустаршынямі камісіі сталі: з беларускага боку — намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Вадзім Іпатаў, з расійскага — першы намеснік старшыні Дзяржаўнай Думы Іван Мельнікаў.

Парламенцкі сход Саюза Беларусі і Расіі прыняў заяву па пытаннях абароны гістарычнай праўды, захавання гістарычнай памяці. У заяве адзначана, што дэпутаты Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі выступаюць за непрымірымую барацьбу з фальсіфікацыяй гісторыі, недапушчэнне зносу помнікаў, вандалізму ў адносінах да пахаванняў савецкіх салдат, адраджэння ідэалогій выключнасці — нацызму, русафобіі, антысемітызму і іншых відаў практык, якія спрыяюць эскалацыі сучасных форм расізму, расавай дыскрымінацыі, ксенафобіі і звязанай з імі нецярпімасці.

Дэпутаты выказалі сваё перакананне ў тым, што рашэнні Нюрнбергскага трыбунала не падлягаюць перагляду. «Парламенцкі сход Саюза Беларусі і Расіі павінен зрабіць усё, каб захаваць гістарычную памяць аб Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў, — гаворыцца ў заяве. — Мы падтрымліваем і раздзяляем ініцыятывы, звязаныя са стварэннем новай архітэктуры роўнай і недзялімай бяспекі, якая надзейна абараняла б усе дзяржавы з улікам інтарэсаў адна адной. Заканамерны працэс, звязаны са станаўленнем шматпалярнага свету, з узмацненнем новых цэнтраў эканамічнага росту і ўплыву, павінен спрыяць умацаванню міру і супрацоўніцтва паміж краінамі і народамі, захаванне гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў — залог мірнай будучыні».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота БелТА.**

## Да ведама

### На прыём да спікера

23 чэрвеня 2025 г. Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Іванаўна Качанава правядзе асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у г. Мінску (вул. Чырвонаармейская, 9).

Папярэдні запіс будзе ажыццяўляцца 17 і 18 чэрвеня.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# АД ПРАМЫСЛОВАСЦІ І АПК ДА НАВУКІ

## Якія пункты росту ёсць у развіцці супрацоўніцтва Беларусі і Ленінградскай вобласці

Першы намеснік Прэм'ер-міністра Мікалай СНАПКОЎ прыняў удзел у 13-м пасяджэнні сумеснай камісіі па развіцці супрацоўніцтва Беларусі і Ленінградскай вобласці, якое прайшло ў Санкт-Пецярбургу.



Мікалай Снапкоў старшынстваваў з беларускага боку, з расійскага — губернатар Ленінградскай вобласці Аляксандр Драздзенка, паведамілі ў прэс-службе Саўміна.

Першы віцэ-прэм'ер адзначыў, што ў 2024 годзе ўзаемны тавараабарот Беларусі і Ленінградскай вобласці ўпершыню за многія гады пераадолеў мяжу ў 1 мільярд долараў і да ўзроўню 2020 года павялічыўся ў 2 разы.

— Ленінградская вобласць займае 7-е месца сярод суб'ектаў Расійскай Федэрацыі па аб'ёме тавараабароту з Рэспублікай Беларусь. Вынікі І квартала 2025 года таксама сведчаць пра рост тавараабароту, — акцэнтаваў Мікалай Снапкоў.

Разам з тым захоўваюцца рэзервы для далейшага нарошчвання ўзаемнага тавараабароту, забеспячэння яго збалансаванасці.

— У сувязі з гэтым лічу своечасовым правядзенне пасяджэння сумеснай камісіі для выпрацоўкі ўзаемавыгадных кірункаў далейшага супрацоўніцтва, вызначэння дадатковых апорных пунктаў, якія будуць закладзены ў фарміраванне абноўленых двухбаковых праграм гандлёва-эканамічнага, навукова-тэхнічнага і гуманітарнага супрацоўніцтва на 2026—2027 гады, — падкрэсліў першы намеснік кіраўніка ўрада.

Гаворачы аб актуальных аспектах бягучага ўзаемадзеяння паміж Беларуссю і Ленінградскай вобласцю, Мікалай Снапкоў акцэнтаваў увагу на пашырэнні супрацоўніцтва ў галіне водападрыхтоўкі і будаўнічым сектары.

За апошнія чатыры гады беларускай арганізацыяй «Палімерканструкцыя» праведзены мантаж больш за 50 станцый водападрыхтоўкі, 5 аб'ектаў знаходзяцца ў працэсе правядзення пусканаладачных работ. У бліжэйшай перспектыве пачнецца рэалізацыя яшчэ 7 праектаў.

— Якасць абсталявання, яго мантаж і сэрвіснае абслугоўванне забяспечваюцца на самым высокім узроўні, — сказаў першы віцэ-прэм'ер.

У будаўнічым сектары беларускімі падрадчыкамі з выкарыстаннем беларускіх матэрыялаў вядзецца ўзвядзенне Высоцкага збожжавага тэрмінала ў Выбаргскім раёне.

Беларусь таксама зацікаўлена ва ўдзеле ў будаўніцтве новых аб'ектаў рознага тыпу, а таксама ў іх праектаванні.

Была закранута і тэма супрацоўніцтва ў аграпрамысловай сферы.

— У цэлым нядрэнна ідзе праца па пастаўках сельскагаспадарчай прадукцыі і харчавання ў Ленінградскую вобласць. Магчымыя дадатковыя кірункі супрацоўніцтва ў аграпрамысловай сферы мы абмяркоўвалі неаднаразова, пачынаючы з узаемнага павелічэння паставак прадуктаў харчавання да супрацоўніцтва ў сферы раслінаводства, жывёлагадоўлі, укаранення новых тэхналогій земляробства, у тым ліку з прымяненнем сучасных тэхналагічных рашэнняў, — заявіў Мікалай Снапкоў.

Беларускі бок гатовы нарошчваць свой удзел у праграмах развіцця сельскай гаспадаркі Ленінградскай вобласці і зацікаўлены ў прасоўванні на рынак беларускіх кармоў і прэміксаў для рыбаводных гаспадарак рэгіёна.

— Адным словам, напрацовак дастаткова, неабходна надаць імпульс пачатку іх хутчэйшай рэалізацыі. На нашу думку, прыйшоў час структураваць супрацоўніцтва ў аграрным комплексе, напрыклад шляхам фарміравання адпаведнай міжведамаснай праграмы супрацоўніцтва, — адзначыў першы віцэ-прэм'ер.

Абмеркавалі бакі і супрацоўніцтва ў сферы прамысловасці.

— Пацвярджаем гатоўнасць да далейшых паставак неабходнай дарожнай, камунальнай, кар'ернай, пасажырскай і спецыяльнай тэхнікі, а таксама сельскагаспадарчай тэхнікі і навяснога абсталявання. Нядрэннымі тэмпамі ідуць пастаўкі ліфтавага абсталявання, — заявіў першы віцэ-прэм'ер.

Мікалай Снапкоў прапанаваў выкарыстоўваць фінансавыя механізмы Банка развіцця Рэспублікі Беларусь для закупкі беларускай тэхнікі.

На пасяджэнні таксама абмяркоўвалася гуманітарнае супрацоўніцтва: у сферах адукацыі і навукі.

**Маргарыта ЗАРОЎКІНА.**

З НАГОДЫ

# ЛЯЧЫЦЬ І ЛЯЧЫЦЦА

## Сістэма аховы здароўя Беларусі выбудавана і функцыянуе эфектыўна

У мінулыя выхадныя ў Беларусі адзначаўся Дзень медыцынскіх работнікаў. З гэтай нагоды міністр аховы здароўя Аляксандр ХАДЖАЕЎ у эфіры тэлеканала «Беларусь-1» расказаў, якія задачы цяпер стаяць перад галіной і чаму замежнікі звяртаюцца па меддапамогу да беларускай медыцыны.



Аляксандр Хаджаеў заявіў, што развіццё сістэмы аховы здароўя кожны год актуалізуецца.

— Забеспячэнне лекамі, якаснай і даступнай дапамогай на ўсіх узроўнях — у вёсцы, у горадзе, у невялікіх раёнах — мы планамерна працуем ва ўсіх гэтых кірунках.

Акрамя гэтага, Аляксандр Хаджаеў адзначыў, што на гэты момант 62 % лекавых прэпаратаў, якія вырабляюцца ў Беларусі, не каштуюць больш за 2 долары. І калі гэтыя 62 % узяць за 100 %, то 32 % прэпаратаў — тыя, якія каштуюць менш за 1 долар, падкрэсліў ён.

— На сёння 60 % лекавых прэпаратаў, якія выкарыстоўваюцца ў фармулярах, вырабляюцца на тэрыторыі нашай краіны, гэта і ёсць наша фармакалагічная бяспека. У нас стаіць задача давесці сёлета гэта значэнне да 70 %, — заявіў міністр аховы здароўя.

Ён перакананы, што трэба працягваць працаваць над тым, каб асартымент прадукцыі, якая вырабляецца ў Беларусі, быў даступны шырокім слаям насельніцтва.

— Гэта задача вырашаецца ў тым ліку на сістэмным узроўні. Ёсць раёны, вёскі, дзе пражывае нязначная колькасць людзей. І мы туды мабільным чынам дастаўляем тыя лекавыя прэпараты, якія гэтыя людзі могуць выкарыстоўваць, — патлумачыў Аляксандр Хаджаеў.

Таксама міністр аховы здароўя падзяліўся, чаму замежнікі звяртаюцца да беларускай аховы здароўя. Аляксандр Хаджаеў адзначыў, што каля 160 тысяч замежных грамадзян у 2024 годзе былі абслужаны ў Беларусі ў фармаце экспарту паслуг.

— Даволі значная лічба. Гэта каля 159 краін, якія на сёння змаглі атрымаць дапамогу ў нашай краіне. Дадзеныя факты сведчаць, што наша сістэма аховы здароўя вядомая ў іншых краінах па сваёй якасці і эфектыўнасці.

Па словах Аляксандра Хаджаева, у сістэме аховы здароўя сёння каля 315 тысяч пасад.

— Колькасць фізічных асоб, якія працуюць у гэтай сістэме, каласальная, — лічыць ён. — Гэта і ўрачы, і медсёстры.

Міністр аховы здароўя таксама падзяліўся прынцыпам, якога ён прытрымліваецца ў працы з людзьмі.

— Нельга сыходзіць ад адказу на любое пытанне, якое ставіцца людзьмі. На любое пытанне павінна быць пададзена аб'ектыўная карціна. Чаму? Таму што толькі тады сістэма будзе развівацца. Мне здаецца, пры зносінах з нашымі людзьмі дыферэнцыравана мы выбіраем тое, над чым павінны працаваць, пацвярджаем гэтыя праблемы і выбудоўваем стратэгічную пазіцыю па іх вырашэнні.

**Па матэрыялах sb.by**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИНФОРМАЦИЯ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | Могилевский лесхоз, г. Могилев, ул. Крупской, 140. УНП 700336549 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191 224 638. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

| № лота | Предмет электронных торгов | Начальная цена, с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Машина погрузочно-транспортная МПТ-461.1,** (в составе с **трактором «Беларус-82.2»**, рег. № ТВ-6 1648, зав. № 172001952, 2012 г. в. и **полуприцепом ПЛ-9**, рег. № БЮ 3372, зав. № 1002 (0450), 2013 г. в.) | **60 600,00** |
| 2 | **Прицеп специальный ПС-30**, рег. № ТВ-6 8135, зав. № 053, 2012 г. в. | **24 000,00** |
| 3 | **Грузовой лесовоз УРАЛ 4320**, рег. № ТВ 1654, кузов № 012183, 1982 г. в. | **10 920,00** |
| 4 | **Трактор Беларус 892.2**, рег. № ІВ-6 3376, зав. № 90827961, 2014 г. в. | **19 560,00** |
| **Местонахождение – г. Могилев, ул. Крупской, 140** | | |

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 27.06.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **26.06.2025** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу (http://gki.gov.by)

**Контактные телефоны:** +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35.
**E-mail:** auction@cpo.by



**Могилевский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества**
**ОАО «Могилевхимволокно»**

**Аукцион состоится 02.07.2025 в 11.00**
**по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352**

Лот № 1 – **Капитальное строение с инв. № 700/С-49678 – Здание свинарника на 984 головы,** пл. – 2225,3 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-49676 – Здание свинарника-откормочника,** пл. – 1663,3 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-49675 – Здание свинарника,** пл. – 2081,0 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-49672 – Свинарник на 386 холостых и супоросных маток,** пл. – 1650,0 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-64770 – Пункт технического обслуживания,** пл. – 308,0 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-74581 – Изолятор свинотоварной фермы на 3000 голов в год,** пл. – 402,2 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-64771 – Здание зерносклада,** пл. – 867,0 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-49684 – Здание убойного цеха СТФ,** пл. – 226,8 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-64767 – Здание станции перекачки навозных стоков,** пл. – 11,0 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-64849 – Административное здание,** пл. – 45,0 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-64852 – Бытовое здание,** пл. – 122,0 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-75400 – Здание навозоприемника,** пл. – 30,0 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-75399 – Насосная станция пожаротушения,** пл. – 11,0 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-75401 – Здание трансформаторной подстанции,** пл. – 41,0 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-75529 – Благоустройство (ограждение, покрытие),** состоящее из 2-х ограждений общ. пл. 1812,1 кв. м, ворот общ. пл. 18,7 кв. м, калитки общ. пл. 4,01 кв. м, покрытия асфальтобетонного, покрытия бетонного, покрытия из бетонной плитки общ. пл. 5341,7 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-75403 – Навозохранилище, пруд-отстойник,** состоит из навозохранилища пл. 1518,0 кв. м, пруда-отстойника пл. 1107,1 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-75402 – Летний лагерь для свиней,** состоит из бетонного покрытия пл. 662,4 кв. м, ограждения металлического пл. 179,2 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-75405 – Летний лагерь для свиней,** состоит из бетонного покрытия пл. 675,4 кв. м, ограждения металлического пл. 325,4 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-93316 – Наружная канализация:** подземное сооружение наружной канализации протяженностью 382,93 м, состоящее из трубопровода безнапорного, колодца, расположено на земельном участке с кадастровым номером 724400000001002907 (присвоен предварительно).

В состав лота № 1 также входят основные средства и краткосрочные активы, список которых предоставлен на торговой площадке gostorg.by и дополнительно может быть предоставлен по запросу.

Лот № 1 расположен по адресу: Могилевская обл., Могилевский р-н, Вейнянский с/с, 64, 64/2, 64/3, 64/4, 64/5, 64/6, 64/7, 64/8, 64/9, 64/10, 64/11, 64/12, 64/13, 64/14 западнее д. Вильчицы.

Сведения о земельном участке: кадастровый номер 724480400001000070 (площадь 5,3364 га, право постоянного пользования, адрес: Могилевская обл., Могилевский р-н, Вейнянский с/с, 64, западнее д. Вильчицы).

Обременение: ипотека в отношении капитальных строений с инв. № № 700/С-49672, 700/С-49675, 700/С-49676, 700/С-49678, 700/С-49684, 700/С-64770, 700/С-64771, 700/С-64852, 700/С-74581

Обстоятельства, препятствующие перерегистрации права собственности: расхождение данных, отраженных в свидетельстве (удостоверении № 700/571-4048) с данными техпаспорта и данными в ЕГРНИ в отношении капитального строения с инв.№ 700/С-49672. Продавцом не предоставлены сведения об отсутствии признаков капитальности в отношении некоторых объектов основных средств.

**Начальная цена продажи: 2 906 638,87 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка 290 663,89 бел. руб.**

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901. Срок подачи документов для участия в аукционе: по 01.07.2025 до 11.00. Полный перечень имущества, входящий в состав лота № 1, порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY.

**Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Минский завод игристых вин»**
(Продавец).

**Электронные торги состоятся 22.07.2025.**

**Лот № 1:** Сборник стальной эмалированный 50 куб. м, инв. 0000122/00. Ёмкость для хранения 1982 года.
**Лот № 2:** Сборник стальной эмалированный 50 куб. м, инв. 0000123/00. Ёмкость для хранения 1983 года, 50 куб. м.
**Лот № 3:** Сборник стальной эмалированный 50 куб. м, инв. 0000124/00. Ёмкость для хранения 1983 года, 50 куб. м.
**Лот № 4:** Сборник стальной эмалированный 50 куб. м, инв. 0000125/00. Ёмкость для хранения 1983 года, 50 куб. м.
**Лот № 5:** Сборник стальной эмалированный 50 куб. м, инв. 0000126/00. Ёмкость для хранения 1983 года, 50 куб. м.
**Лот № 6:** Сборник стальной эмалированный 50 куб. м, инв. 0000127/00. Ёмкость для хранения 1983 года, 50 куб. м.
**Лот № 7:** Сборник стальной эмалированный 50 куб. м, инв. 0000128/00. Ёмкость для хранения 1983 года, 50 куб. м.
**Лот № 8:** Сборник стальной эмалированный 50 куб. м, инв. 0000129/00. Ёмкость для хранения 1983 года, 50 куб. м.
**Лот № 9:** Сборник стальной эмалированный 50 куб. м, инв. 0000133/00. Ёмкость для хранения 1983 года, 50 куб. м.
**Лот № 10:** Сборник стальной эмалированный 50 куб. м, инв. 0000134/00. Ёмкость для хранения 1983 года, 50 куб. м.
**Лот № 11:** Сборник стальной эмалированный 50 куб. м, инв. 0000135/00. Ёмкость для хранения 1987 года, 50 куб. м.
**Лот № 12:** Сборник стальной эмалированный 50 куб. м, инв. 0000136/00. Ёмкость для хранения 1987 года, 50 куб. м.
**Лот № 13:** Сборник стальной эмалированный 50 куб. м, инв. 0000137/00. Ёмкость для хранения 1987 года, 50 куб. м.
**Лот № 14:** Сборник стальной эмалированный 50 куб. м, инв. 0000138/00. Ёмкость для хранения 1987 года, 50 куб. м.
**Лот № 15:** Сборник стальной эмалированный 50 куб. м, инв. 0000139/00. Ёмкость для хранения 1987 года, 50 куб. м.
**Лот № 16:** Сборник стальной эмалированный гор. ССЭН -50-5-30 РФ, инв. 0000776/00. Ёмкость для хранения 1990 года, 50 куб. м.
**Лот № 17:** Сборник стальной эмалированный гор. ССЭН -50-5-30 РФ, инв. 0000777/00. Ёмкость для хранения 1992 года, 50 куб. м.
**Лот № 18:** Сборник стальной эмалированный гор. ССЭН -50-5-30 РФ, инв. 0000778/00. Ёмкость для хранения 1993 года, 50 куб. м.
**Лот № 19:** Сборник стальной эмалированный гор. ССЭН -50-5-30 РФ, инв. 0000779/00. Ёмкость для хранения 1999 года, 50 куб. м.

Начальная цена Лотов №№ 1–19 с НДС 20 % –
6 360,00 руб. по каждому из Лотов.
Задаток – 636,00 руб. по каждому из Лотов.

**Местонахождение Лотов №№ 1–19:**
г. Минск, ул. Радиальная, 50.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900 100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **18.07.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,**
**torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**ООО «РеалтЭксперт»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 18.07.2025.**

**Лот № 1:** Сооружение модульного типа
(7,0х4,60х3,5 м) № 1, 32,20 кв. м.

**Лот № 2:** Сооружение модульного типа
(7,0х4,60х3,5 м) № 2, 32,20 кв. м.

**Лот № 3:** Сооружение модульного типа
(7,0х4,60х3,5 м) № 3, 32,20 кв. м.

**Начальная цена Лотов №№ 1–3 с НДС 20 %** –
48 300,00 руб. за каждый лот.

**Задаток** – 4 830,00 руб. по каждому Лоту.

**Местонахождение Лотов №№ 1–3:**
г. Минск, ул. Серова, 2А.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900 100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **16.07.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,**
**torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182

АКЦЭНТЫ

# НАДЗЕЙНАСЦЬ У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

## Міністр энергетыкі расказаў, як энергасістэма Беларусі рыхтуецца да магчымай непагадзі і ацяпляльнага сезона

Дзяніс МАРОЗ у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» адзначыў, што непагадзь, якая абрынулася на Беларусь у ліпені мінулага года, прымусіла па-іншаму паглядзець на пабудову энергетычнай сістэмы.



— Да ліпеня мінулага года такога маштабу ўздзеяння непагадзі на энергасістэму ніколі не было. На працягу трох дзён у краіне без электразабеспячэння заставалася тры тысячы населеных пунктаў, было пашкоджана 550 км ліній электраперадачы, 1,5 тысячы апор ад ліній электраперадачы былі фізічна знішчаны, — нагадаў ён. — Але беларусы заўсёды з цяжкасцяў робяць высновы. Дзякуючы тым рашэнням, якія прыняты на ўзроўні кіраўніка дзяржавы, мы сфарміравалі праграму дзеянняў, накіраваных на павышэнне надзейнасці электразабеспячэння, каб наша энергасістэма была гатовая да такіх непагодных уздзеянняў.

Кіраўнік профільнага міністэрства звярнуў увагу, што праз змены кліматычных умоў ёсць імавернасць таго, што стыхія можа абрынуцца зноў. У гэтай сувязі важна зрабіць усё, каб у наступны раз энергасістэма была больш гатовая.



— Што мы зрабілі? Адзін з найважнейшых кірункаў — павелічэнне колькасці дызель-генератарных установак як у энергасістэме, так і не ў энергасістэме, — растлумачыў Дзяніс Мароз. — Толькі ў энергасістэме мы на трацiну павялічваем колькасць дызель-генератарных установак, каб, калі раптам непагадзь разбурыць лінію электраперадачы, мы маглі прывезці дызель-генератарную ўстаноўку ў населены пункт і забяспечыць яго электрычнай энергіяй. Акрамя саміх энергетыкаў, такой жа працай займаюцца і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, і прадпрыемствы жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Яшчэ адной важнай галіной кіраўнік Мінэнерга назваў укараненне сучасных тэхналогій, а менавіта выкарыстанне беспілотных лятальных апаратаў.

— Падчас уздзеяння непагадзі вельмі важным з'яўляецца вызначэнне маштабаў пашкоджання, пунктаў, дзе яно адбылося, каб максімальна аператыўна выехаць на месца і яго ліквідаваць. У адпаведнасці з планамі Міністэрства энергетыкі мы ў чатыры разы збіраемся павялічыць колькасць беспілотных лятальных апаратаў, якія будуць выкарыстоўвацца ў энергасістэме.

Вельмі вялікая ўвага ў дзяржаве надаецца рэканструкцыі сістэмы электразабеспячэння. Па словах Дзяніса Мароза, калі летась было рэканструявана ў агульным аб'ёме тры тысячы км сетак, то на гэты год план — 3450 км.

— У цэлым мы плануем нарасціць аб'ёмы рэканструкцыі ў бліжэйшы час да 4 тысяч км электрасетак у год. Усё гэта будуць новыя сучасныя лініі, забяспечаныя максімальнай надзейнасцю, каб жыхары нашай краіны не адчувалі ўздзеяння непагадзі.

Кіраўнік Мінэнерга таксама закрануў пытанне падрыхтоўкі энергетыкаў да ацяпляльнага сезона.

— Энергетыкі для таго, каб падрыхтаваць крыніцу цеплавой энергіі, запланавалі на бліжэйшы перыяд да ацяпляльнага сезона выкананне капітальнага рамонту на 250 адзінках тэхналагічнага абсталявання. У рамках гэтай працы будзе правераны стан абсталявання, праведзены капітальныя рамонты і будзе пераканана сць у тым, што цеплакрыніца будзе гатовая. Што датычыцца цеплавых сетак, то праводзіцца дыягностыка іх стану, вядуцца капрамонты і бягучыя рамонты, каб не дапусціць парываў сістэмы цеплазабеспячэння. У цэлым у гэтым працэсе рухаемся наперад. Калі ў 2024 годзе за аналагічны перыяд у нас было тры адключэнні сістэмы цеплазабеспячэння праз тое, што былі парывы, то сёлета толькі адно. Але і гэта шмат, мы лічым, што сістэма цеплазабеспячэння павінна працаваць так, каб перапынкаў не было.

**Па матэрыялах sb.by**

ЭКАНОМІКА

# ВА ЎНІСОН З ПАТРЭБАМІ ЧАСУ

## На ЕЭФ разгледзяць пытанні канкурэнтнай палітыкі

У рамках IV Еўразійскага эканамічнага форуму ў Мінску пройдуць дзве тэматычныя сесіі, прысвечаныя пытанням канкурэнцыі антыманапольнага рэгулявання. У прэс-службе ЕЭК паведамілі, што гэтыя важныя тэмы ўдзельнікі абмяркуюць 26 чэрвеня.

На сесіі «Развіццё фармацэўтычнага рынку: доступ і даступнасць», якая пройдзе пад старшынствам міністра па канкурэнцыі і антыманапольным рэгуляванні ЕЭК Максіма Ермаловіча, плануецца абмеркаваць фарміраванне агульнага рынку лекавых сродкаў ЕАЭС (дзе мы цяпер, якія ёсць складанасці і перспектывы далейшага развіцця);

ролю антыманапольных органаў у развіцці канкурэнцыі на фармацэўтычных рынках;

рэгуляванне цэн на лекавыя сродкі (лепшыя нацыянальныя практыкі і ці трэба зблiжаць падыходы ў рамках ЕАЭС). Удзельнікі абмяркуюць таксама бар'еры на фармацэўтычных рынках (што варта скарэктаваць для паступальнага развіцця галіны) і меры, якія дазволяць нарасціць уласную вытворчасць арыгінальных лекаў, што выпрабляюцца ў ЕАЭС, каб у поўнай меры забяспечыць патрэбу грамадзян краін саюза ў даступных і якасных леках.

Як патлумачылі арганізатары, асновай дыскусіі стануць вынікі праведзенага Дэпартаментам антыманапольнага рэгулявання ЕЭК даследавання фармацэўтычнага сектара ЕАЭС.

Трэба адзначыць, што сектар патрабуе пастаяннага кантролю і мер падтрымкі з боку нацыянальных і Еўразійскага рэгулятараў з улікам павышаных патрабаванняў да ўмоў вытворчасці і абарачэння лекавых прэпаратаў, абмежаванасці бюджэтных рэсурсаў для закупак лекаў, іншых фактараў, якія хутка змяняюцца, тэхналогій вытворчасці, запытаў, што растуць, медыцынскай супольнасці і спажыўцоў.

Спікерамі выступяць намеснік міністра аховы здароўя Беларусі Аляксандр Старавойтаў, намеснік кіраўніка ФАС Расіі Цімафей Ніжагародцаў, кіраўнікі фармацэўтычных асацыяцый, прадстаўнікі профільных дзяржаўных органаў, навукі і бізнесу з усіх краін «пяцёркі».

На сесіі «Сучасная канкурэнтная палітыка: выклікі і перспектывы», якая таксама пройдзе з удзелам міністра па канкурэнцыі і антыманапольным рэгуляванні ЕЭК Максіма Ермаловіча, плануецца абмеркаваць задачы органаў па канкурэнцыі, існуючыя механізмы рэгулявання (ці дастаткова іх для выканання сучасных задач), меры па забеспячэнні справядлівай канкурэнцыі ў свеце, які хутка змяняецца. Удзельнікі таксама абмяркуюць інструменты, якія могуць забяспечыць баланс інтарэсаў у грамадстве і эканоміцы; ролю дзяржавы і бізнесу ў фарміраванні канкурэнтнага асяроддзя; падыходы канкурэнтных ведамстваў краін ЕАЭС і замежных партнёраў.

Па задуме арганізатараў, асноўная задача сесіі — пазначыць ключавыя выклікі, з якімі сутыкаюцца канкурэнтныя органы на сучасным этапе, абмеркаваць меры і механізмы, неабходныя для забеспячэння справядлівай канкурэнцыі ў свеце.

Асобная ўвага будзе ўдзелена замежнаму вопыту. Прадстаўнікі кіраўніцтва канкурэнтных органаў Ірана, Кітая, Узбекістана падзеляцца краінавым вопытам рэалізацыі эфектыўнай канкурэнтнай палітыкі, а таксама кейсамі па рэагаванні на хуткія змены ў тэхналогіях і на рынках.

ПРЫЯРЫТЭТЫ

# НАША ГАЛОЎНАЕ БАГАЦЦЕ

## Як па-гаспадарску распарадзіцца зямельнымі рэсурсамі?

**Па меркаванні дырэктара Інстытута меліярацыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандра АНЖАНКОВА, праблему ў Беларусі стварае не колькасць ападкаў, а іх дыферэнцыяцыя па месяцах. «Мы ўспамінаем сітуацыю пазамінулага года, калі май—чэрвень аказаліся засушлівымі, што сур'ёзна адбілася на вытворчасці сельгаскультур», — нагадаў ён. Таму, падкрэсліў навуковец, меліярацыйныя сістэмы вымушаны працаваць у вельмі складанай абстаноўцы.**

«Нягледзячы на перыяды засухі, якія пачашчаюцца, неабходнасць вясной адводу залішняй вады да гэтага часу дазваляе выйсці сельгастэхніцы ў палі на два—шэсць тыдняў раней, чым калі б меліярацыйных сістэм не было. Як вынік — неабходнасць кіравання вадой становіцца двухбаковай. У перыяд паводкі і дажджоў трэба ваду адвесці з сельгастэрыторый, а пры месячных засухах, наадварот, яе захаваць. Таму вядзецца работа па рэканструкцыі і ўдасканаленні меліярацыйных сістэм», — растлумачыў Аляксандр Анжанкоў.

### ВАДЫ ТО МАЛА, ТО ЗАНАДТА

Пры сярэдняй засусе зніжэнне ўраджайнасці збожжавых і зернебабовых культур у Беларусі складае 10—20 %, пры экстрэмальнай — да 30—40 %. І, наадварот, такія ж страты могуць здарыцца пры няправільна адрэгуляваным водаадводным рэжыме з наступным пераўвільгатненнем глебы.

Паўстае пытанне арашэння зямель — адзін з самых дарагіх спосабаў рэгулявання сельскагаспадарчых палеткаў. «Так, у нас пабудаваны вадасховішчы для гэтага, але іх эксплуатацыя — мерапрыемствы даволі дарагія, і без падтрымкі дзяржавы і пілотных праектаў па вывучэнні эфектыўнасці гэтых актыўнасцяў казаць аб маштабным абвадненні рэспублікі не атрымаецца».

Падзенне ўзроўню вады ў рэках і азёрах — гэта агульнасусветная тэндэнцыя, не толькі беларуская, працягнуў Аляксандр Анжанкоў. На прыкладзе аналізу такіх рэк, як Амазонка, Рэйн, Эльба, Вісла, Волга, высветлілася, што ва ўсіх абнаўляюцца мінімумы ўзроўню вады. Што ж рабіць? Прымаць меры па захаванні вады на тэрыторыі Беларусі і правільна яе пераразмяркоўваць.

Як адзначыла **начальнік службы гідралогіі і аграметэаралогіі Белгідрамета Кацярына ІСТОМІНА**, праблема засух для нашай тэрыторыі вельмі актуальная. Напрыклад, адно з наступстваў працяглых спякотных перыядаў — пажары ў лясах і на тарфяніках. За апошнее дзесяцігоддзе верагоднасць узнікнення засух і іх працягласць павялічылася як за кошт змянення клімату, так і за кошт антрапагеннага ўздзеяння на прыроднае асяроддзе. Адным з неспрыяльных для культур паказчыкаў з'яўляецца глебавая засуха. А яна вынікае з засухі атмасфернай.

«З 1989 года, калі пачалося глабальнае змяненне клімату, значна вырасла паўтаральнасць глебавых засух. Часцей яны назіраюцца ў паўднёвым рэгіёне краіны, што ў першую чаргу звязана з высокім тэмпературным рэжымам з даволі лёгкімі па механічным складзе глебамі. Часцей глебавыя засухі бываюць летам, але ў апошнія гады мы адзначаем іх у верасні або, наадварот, у маі — пачатку чэрвеня», — адзначыла Кацярына Істоміна.

Апошнім часам пачасціліся засухі менавіта ў чэрвені і жніўні. Максімальная паўтаральнасць у дзевяці гадах з дзесяці ў гэтыя месяцы назіраецца на Гомельшчыне, дзе таксама ўдвая павялічылася паўтаральнасць глебавых засух у верасні — такое фіксуецца часцей, чым праз год. «За перыяд пацяплення глебавыя засухі працягласцю месяц і больш у Гомельскай і Брэсцкай абласцях здараюцца ў сямі — дзевяці гадах з дзесяці. У Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях — раз на пяць-шэсць гадоў. У Віцебскай — тры з дзесяці. У Гомельскай вобласці таксама — прыкладна адзін раз на два гады, у Брэсцкай — адзін раз на двалры гады засухі ахопліваюць не менш чым 30 % тэрыторыі», — акрэсліла сітуацыю спецыяліст.

### ГАЛОЎНЫ ВОРАГ УРАДЖАЮ

**Вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі кліматычных даследаванняў, кандыдат геаграфічных навук Інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі Віктар МЕЛЬНІК** адзначыў, што з-за недахопу вільгаці ўраджайнасць зніжаецца больш, чым з-за замаразкаў і іншых з'яў надвор'я. Звычайна ўтрыманне вільгаці ў верхнім пласце глебы знаходзіцца на ўзроўні каля 2 міліметраў. Пачынаючы з перыяду пацяплення, ідзе яго паніжэнне. Але найбольш істотнае паніжэнне ў краіне адзначаецца толькі ў Гомельскай вобласці.

Што рабіць? Задача навукоўцаўбатанікаў — выводзіць новыя засухаўстойлівыя сарты, агратэхнікаў — прымяняць эфектыўныя прыёмы назапашвання і вывядзення вільгаці. А аграрыям трэба выбіраць аптымальныя тэрміны сяўбы і размеркавання культур з улікам мікракліматычных асаблівасцяў мясцовасці.

Рост тэмпературы працягнецца, папярэдзіў кліматолаг. А значыць, будзе павышанае выпарванне глебавай вільгаці і засушлівасць. Павелічэнне ападкаў таксама будзе, але ў асноўным яно прагназуецца ў зімовы, вясновы і восеньскі перыяды, а летам вады з неба будзе ўсяго на 3—5 % больш.

У паўднёвых раёнах Беларусі пашыраецца сяўба такіх засухаўстойлівых кармавых культур, як люцэрна і суданская трава. У іх магутная каранёвая сістэма, і адчуваюць яны сябе нядрэнна. У перыяд узмацнення засух (май—чэрвень) павялічваюць сяўбу азімых культур. Яны да пачатку спякоты ўжо добра ўкараняюцца і назапашваюць вільгаць. У апошнія гады таксама з-за змены клімату ў Беларусі зменшылася сяўба азімага жыта і трыцікале, затое пашырыліся плошчы азімага ячменю, які паспявае да пачатку засух.

Рэалізаваны шэраг практычных мерапрыемстваў па прадухіленні пагаршэння і аднаўленні дэградаваных зямель, адзначыў **намеснік начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй КАСЦЮК.** У мэтах падтрымання і аднаўлення ўрадлівасці глеб сельскагаспадарчых зямель унесена 50,3 мільёна тон арганічных угнаенняў, а таксама праведзена вапнаванне сельскагаспадарчых зямель на плошчы 255 тысяч гектараў. Акрамя таго, выканана рэканструкцыя меліярацыйных сістэм на плошчы 60,2 тысячы гектараў. Вельмі важным з'яўляецца той факт, што працягваецца работа па ўкараненні тэхналогіі мінімальнай апрацоўкі глебы і тэхналогіі дакладнага земляробства.

**Сяргей КУРКАЧ.**




ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ
ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321) по поручению **Сельскохозяйственного филиала «Красный май» ОАО «Минский завод игристых вин»** (продавец, место нахождения: 222812, Минская область, Пуховичский район, аг. Блужа, ул. Центральная, д. 42/1) проводит повторный открытый аукцион

**по продаже транспортных средств,**

расположенных по адресу:

**Минская область, Пуховичский район, аг. Блужа, ул. Центральная, д. 42/1**

Лот № 1: **Комбайн зерноуборочный самоходный КЗС-1218 «ПАЛЕССЕ GS12», 2008 г. в., регистрационный знак ОН-5 1464, заводской № 1040, инв. № по бух. учету 8007.**
**Начальная цена с НДС (20 %) – 15 408,00 бел. руб.**
**Задаток 10 % от начальной цены – 1 540,00 бел. руб.**
**Стоимость снижена на 40 %.**

Лот № 2: **Комбайн зерноуборочный самоходный КЗС-1218 «ПАЛЕССЕ GS12», 2008 г. в., регистрационный знак ОН-5 1465, заводской № 1034, инв. № по бух. учету 8008.**
**Начальная цена с НДС (20 %) – 23 400,00 бел. руб.**
**Задаток 10 % от начальной цены – 2 340,00 бел. руб.**
**Стоимость снижена на 40 %.**

Лот № 3: **Автомобиль легковой внедорожник универсал GEELY EMGRAND X7, 2014 г. в., регистрационный знак 0372 НВ-5, кузов (VIN) № Y4K8762Z9EB005905, цвет белый, инв. № по бух. учету 1106-19.**
**Начальная цена с НДС (20 %) – 4 248,00 бел. руб.**
**Задаток 10 % от начальной цены – 424,00 бел. руб.**
**Стоимость снижена на 40 %.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) календарных дней с даты проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее, чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 10.04.2025.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, rlt.by.

Электронные торги состоятся **30.06.2025** в **10.00**.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.06.2025** до **17.00**.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: 8 (029) 370 73 35.**

УНН 601055512



**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ ООО «НикаПроект»,**

*опубликованную в газете «Звязда» от 26.02.2021 г.*

**по объекту: «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями на пересечении ул. Прилукской – ул. Глаголева – пр. Жукова в г. Минске»**

**3-я очередь строительства 3-7-я секции**

Застройщик: Общество с ограниченной ответственностью «НикаПроект», зарегистрированное в ЕГР 22.03.2011 за № 191581623.

Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договора о создании объектов долевого строительства предлагается 100 машино-мест площадью от 12,50 кв. м до 17,54 кв. м, в возводимом подземном двухуровневом неотапливаемом гараже-стоянке с выходами во двор и (или) на улицу, а также в жилую часть здания.

Стоимость строительства определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа. Стоимость строительства общей площади объектов долевого строительства в текущих ценах составляет:

- машино-место, общая площадь 12,50 кв. м – эквивалентно 10 000 долларов США;
- машино-место, общая площадь 13,50 кв. м – эквивалентно 12 000 долларов США;
- машино-место, общая площадь 13,75 кв. м – эквивалентно 12 000 долларов США;
- машино-место, общая площадь 13,78 кв. м – эквивалентно 12 000 долларов США;
- машино-место, общая площадь 14,00 кв. м – эквивалентно 13 000 долларов США;
- машино-место, общая площадь 14,28 кв. м – эквивалентно 13 000 долларов США;
- машино-место, общая площадь 14,85 кв. м – эквивалентно 13 000 долларов США;
- машино-место, общая площадь 15,25 кв. м – эквивалентно 15 000 долларов США;
- машино-место, общая площадь 15,39 кв. м – эквивалентно 15 000 долларов США;
- машино-место, общая площадь 15,50 кв. м – эквивалентно 15 000 долларов США;
- машино-место, общая площадь 15,86 кв. м – эквивалентно 15 000 долларов США;
- машино-место, общая площадь 15,98 кв. м – эквивалентно 15 000 долларов США;
- машино-место, общая площадь 17,40 кв. м – эквивалентно 17 500 долларов США;
- машино-место, общая площадь 17,54 кв. м – эквивалентно 17 500 долларов США.

**Условия оплаты:**

единовременная оплата полной стоимости объекта долевого строительства в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном органе. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа. По соглашению сторон, дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости объекта, либо иные условия его оплаты.

УНП 191581623

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА**

**Организатор аукциона: ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1**
**Продавец: Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8.**

**Торги состоятся 09 июля 2025 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, каб. 28**

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Помещение площадью 36,5 кв. м** в капитальном строении – здании специализированном связи с инв. № 340/С-28644, помещение на 3-м этаже. **Адрес:** г. Речица, ул. Советская, 66. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент месторасположения – 1,0. **Условия пользования:** для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организация производства (кроме вредных производств) | **171,28** | 171,28 |
| **Размер штрафа:** 5 % от начальной стоимости лота | Срок договора аренды – 5 (пять) лет, шаг аукциона – 10 (десять)% | | |

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с продавцом по тел. 8 (0232) 79-69-76.
**Для участия в аукционе необходимо:**
**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта»):** р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000, в ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY2X, УНП 400395996, **получатель** – назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах за лот № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа 40901 «Перечисление гарантийного взноса».
**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 17 июня 2025 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.
Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 07 июля 2025 г. в 16.00 включительно.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.
**К участию допускаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица. Необходимые документы:** юридическим или физическим лицом, а также индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представитель юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий, полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 16 мая 2023 г. № 138 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов, ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов.** Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а так же перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения, за вычетом внесенной им суммы задатка. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049 (изм. от 14.08.2021 № 465).
**Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.ocenkaservis.by в разделе «Аукционы»-«Очные торги»;** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by** в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база»

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона:**
**(тел./факс) 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89.**
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**



Организатор торгов
**ООО «Правовая компания «АльтЮрКом»**
**извещает о проведении публичных торгов в форме аукциона по продаже имущества**
**ООО «СЭНС-ГЕРАЛЬДИКА» (УНП 191984119)**

**Дата проведения: 18.07.2025 г. в 12.00**

Адрес проведения: г. Минск, ул. Казинца, д. 11А, оф. Б813.

Предмет торгов: имущество
ООО «СЭНС-ГЕРАЛЬДИКА» (станки, техника)

Начальная стоимость: 24 707,17 бел. руб.

Полный перечень имущества и информацию об условиях торгов можно получить по ссылке:
**https://acg.by/realizacziya-imushhestva-torgi/realizacziya-imushhestva-torgi-ooo-sens-geraldika2/**

УНП 191343750


# «ПЛАНУЮ ЖЫЦЬ І ПРАЦАВАЦЬ У СВАЁЙ РОДНАЙ КРАІНЕ»



Фота БелТА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

...Прыгожыя, прыбраныя і, вядома, усхваляваныя — ад усяго таго, што адбываецца, ад таго, што ў гэты дзень іх, выпускнікоў, амаль ужо самастойных, неяк па-асабліваму апекваюць настаўнікі і бацькі. Употай, а часам і не хаваючыся, дарослыя змахваюць слёзы з вачэй. Больш стрыманыя хлопцы падтрымліваюць сваіх аднакласніц, таму што тыя таксама не-не ды і расплачуцца. Так было, ёсць і будзе заўсёды. Педагогі праводзілі дзяцей з дзяцінства і ўсё яшчэ памяталі іх трохі спалоханымі шасцігодкамі. Яны помняць няўдачы і поспехі сваіх вучняў, таму што былі побач, і ўсё перадольвалі разам з імі.

У мінулым у выпускнікоў цэнтралізаваныя экзамены, у руках — «пропускі» ў будучыню — атэстаты і сертыфікаты. У многіх залатыя і сярэбраныя медалі. Выпускнікі 2025 года паказалі вельмі добрыя вынікі на ЦЭ. Максімальную колькасць балаў — 100 па дзяржаўных мовах атрымалі 979 чалавек.

Іх чакае добрая будучыня, але наперадзе — галоўны экзамен. Мы неяк разгаварыліся з педагогам адной са сталічных школ, якая чакала сваіх вучняў каля пункта здачы цэнтралізаванага экзамена: «Вядома, я хвалююся, — падзялілася настаўніца, — аднак веру, што ўсё ў іх атрымаецца. Больш за ўсё хачу, каб яны выраслі добрымі людзьмі. Яны яшчэ не разумеюць, наколькі хуткаплынны час, і як трэба выкарыстоўваць яго, каб адбыцца не толькі ў прафесіі, але і ў жыцці як грамадзянін сваёй Айчыны. Але ведаю: у іх усё атрымаецца».

А што адчуваюць і думаюць самі выпускнікі? Мы распыталі іх у розных кутках Беларусі:



**Яўген БЯЛЮК, выпускнік гімназіі № 10 імя Мітрапаліта Філарэта (Вахрамеева) горада Гродна:**

«Выпускны... Настрой выдатны! Асабліва ўлічваючы, што здаў два экзамены на высокія балы: матэматыку на 96 і рускую мову на «сто». Я, вядома, задаволены, такія балы даюць мне больш упэўненасці пры паступленні. Мае планы на будучыню — паступіць у БДУІР у Мінску і выбраць спецыяльнасць, звязаную са штучным інтэлектам. Лічу, што гэта перспектыўны кірунак. Планую жыць і працаваць у сваёй роднай краіне, такія спецыялісты тут будуць вельмі запатрабаваныя. Заканчэнне гімназіі выклікае змешаныя пачуцці. З аднаго боку, я рады пачатку новага, дарослага і больш самастойнага этапу ў жыцці. З іншага — гэта нязвыкла і хвалююча. Усё ж правёў тут 11 гадоў. У нас быў дружны клас і ўся паралель таксама. Вядома, буду сумаваць па сваіх аднакласніках і сябрах, але наперадзе столькі цікавага».



**Маргарыта КАРПАЧ, выпускніца Алекшыцкай сярэдняй школы (Бераставіцкі раён), уладальніца залатога медаля:**

«Сёння мы развітваемся са школай і ўступаем у дарослае жыццё. Я шчаслівая, што апошні школьны вечар мы ладзім разам з выпускнікамі раёна, нашымі бацькамі, настаўнікамі і шматлікімі гасцямі. Гэта робіць момант яшчэ больш значным і ўрачыстым. Упэўнена, што ўспаміны аб гэтым дні застануцца з намі назаўжды. Для мяне ён асаблівы яшчэ і таму, што мае намаганні і стаpанні былі адзначаны залатым медалём, да якога імкнулася на працягу адзінаццаці гадоў вучобы. Вельмі рада, што ўсё атрымалася, і ўпэўненая, што мэты, якія ставім перад сабой цяпер, таксама будуць паспяхова дасягнуты, бо для гэтага ў маёй любай Беларусі ёсць усе ўмовы».



**Раман МАНУШЫН, выпускнік гімназіі № 51 горада Гомеля, уладальнік залатога медаля:**

«Вельмі шмат добрых момантаў мне запомніцца са школьнага жыцця: сустрэчы з сябрамі, цікавыя конкурсы, інтэлектуальныя баталіі, спаборніцтвы, мерапрыемствы. Любімым прадметам была матэматыка — люблю знаходзіць нестандартныя рашэнні. Асобная любоў — астраномія. Менавіта па гэтым прадмеце ўдзельнічаў у алімпіядах. Заваяваў дыплом трэцяй ступені Рэспубліканскай алімпіяды па астраноміі. Шчыры дзякуй за падрыхтоўку настаўніку фізікі і астраноміі Сяргею Аляксандравічу Карнавухаву. Самыя цёплыя словы падзякі майму класнаму кіраўніку настаўніцы беларускай мовы Марыі Іванаўне Кірушкінай. Вырашыў паступаць ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, на факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій. Мару вучыцца па спецыяльнасці «Кібербяспека». Хочацца быць карысным сваёй краіне».

**Аліса СМЫШЛЯЕВА, выпускніца магілёўскай сярэдняй школы № 7, уладальніца залатога медаля, удзельніца «Зорнага выпускнога» на плошчы Адзінства ў Магілёве:**

«Выпускны прайшоў шыкоўна і вельмі пышна. Нас, амаль дзве тысячы выпускнікоў, прывезлі на аўтобусах, мы ішлі па спецыяльна створаным калідоры. Вельмі трапяткая была хвіліна, калі нам уручалі ўзнагароды. Я атрымала Падзяку і залаты медаль з рук мэра горада Магілёва Сяргея Чарткова. На плошчы было шмат людзей, яны апладзіравалі, і гэта таксама натхняла... Крыху сумна развітвацца са школай, аднакласнікамі. Вельмі ўдзячна сваім настаўнікам, яны ўклалі ў нас шмат сіл. ЦТ па біялогіі здала на 94 балы. Гэта заслуга ў тым ліку і маёй настаўніцы Вольгі Лістраценка. Яна так добра выкладае прадмет, што не патрэбна дапамога рэпетытараў. Па рускай мове на ЦТ набрала 100 балаў. Гэта мой любімы прадмет, заўсёды ўдзельнічала па ім у алімпіядах. Вынікі тэста па хіміі пакуль не вядомы, але, спадзяюся, таксама будуць нядрэнныя. Збіраюся паступаць у Гомельскі медінстытут. Гэты горад вельмі спадабаўся, калі там пабывала ўпершыню. А яшчэ падабаецца Мінск. Наша Беларусь наогул прыгожая і ўтульная. Планую пабываць ва ўсіх знакавых месцах радзімы. І сваё жыццё не ўяўляю дзесьці ў іншым месцы. У планах — дасканала авалодаць медыцынскай спецыяльнасцю і прыносіць карысць сваёй краіне».



**Алена ВІНАГРАДАВА,**
**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ,**
**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Абітурыент-2025**

## СЯРОД СТАБАЛЬНІКАЎ — МАТЭМАТЫКІ І «ЗАМЕЖНІКІ»

### А ўсяго іх — больш як 700

Сталі вядомыя вынікі правядзення цэнтралізаванага тэсціравання па профільных вучэбных прадметах

У цэнтралізаваным тэсціраванні па 10 профільных вучэбных прадметах — матэматыцы, біялогіі, замежных мовах, геаграфіі, сусветнай гісторыі (найноўшы час) і гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі — паўдзельнічала 30,9 тысячы абітурыентаў. Максімальна магчымы вынік 100 балаў атрымалі 724 абітурыенты, у тым ліку 181 — па матэматыцы, 509 — па замежных мовах.

Кандыдаты ў студэнты паказалі добрыя вынікі. Сярэдні тэставы бал па біялогіі — 56,4 бала, па замежнай мове — 51,2, па матэматыцы — 42,6, па геаграфіі — 68,7, па сусветнай гісторыі (найноўшы час) — 57,8.

Атрымаць інфармацыю аб выніках ЦТ, убачыць скан-копію свайго бланка адказаў, а таксама азнаёміцца з правільнымі адказамі да заданняў экзаменацыйнай (тэставай) работы абітурыенты могуць у асабістым кабінеце на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў. Сертыфікаты ЦТ абітурыенты змогуць атрымаць з 1 ліпеня ў пунктах правядзення, у якіх яны бралі ўдзел у цэнтралізаваным тэсціраванні.

* * *

Нагадваем таксама, што 15 чэрвеня стартавала ўступная кампанія на ўзровень ПТА. У 2025 годзе на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі плануюць прыняць каля 28 тысяч абітурыентаў. Для тых, хто будзе паступаць па мэтавым накіраванні, прадугледжана больш за 5,5 тысячы месцаў — на 1,3 тысячы больш, чым летась.

ЧАС МАЛАДЫХ

# НЕ ПРОСТА ЛІЧБЫ, А БУДУЧЫНЯ НАШАЙ ЭКАНОМІКІ

## Даведаліся пра карысныя праекты ад «Маладых лідараў Міншчыны»

Вось ужо 10 гадоў запар абласны конкурс «Малады лідар Міншчыны» аб'ядноўвае ініцыятыўных, смелых і таленавітых. Яго ўдзельнікі распрацоўваюць унікальныя праекты ў самых розных сферах: ад адукацыі і культуры да медыцыны, прамысловасці і навуковай дзейнасці. Карэспандэнты «Звязды» пазнаёміліся бліжэй з маладымі лідарамі і даведаліся пра іх напрацоўкі, карысныя для ўсёй краіны.




Мінская вобласць па праве лічыцца кузняй талентаў. На гэтай багатай зямлі вучацца, ствараюць і робяць адкрыцці тыя, хто заўтра будзе вызначаць развіццё ўсёй краіны. У гэтым пераконваемся на свае вочы. Так, сярод шматлікіх праектаў — лічбавыя тэхналогіі ў інклюзіўным адукацыйным працэсе, праекты «Зялёная школа», «Ёсць кантакт», «Спадчыннікі ў белых халатах», «Формула ўсмешкі», вэб-платформа для біяінфармацыйнай апрацоўкі даных, высокапрадукцыйнага секвеніравання і многае іншае. Гэта не проста ідэі, а рэальныя крокі да развіцця Мінскай вобласці.

Як адзначыў **старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксей КУШНАРЭНКА,** звяртаючыся да маладых людзей, асноўная мэта конкурсу «Малады лідар Міншчыны» — выявіць і падтрымаць тых, хто не баіцца браць на сябе адказнасць і крэатыўна падыходзіць да вырашэння складаных задач: «У нас таленавітая моладзь, гатовая да дзеяння і здольная натхняць. Вашы ідэі ахапілі розныя сферы: ад адукацыі і культуры да медыцыны, прамысловасці і навуковай дзейнасці. На ўзроўні Мінскага аблвыканкама мы і далей працягнем падтрымліваць моладзь, ствараць умовы для рэалізацыі вашага патэнцыялу. Конкурс — гэта толькі адзін з крокаў на гэтым шляху». Штогод на Міншчыне пачынаюць працоўную дзейнасць амаль 5 тысяч маладых спецыялістаў, пераважная большасць з якіх працуе ў сферы прамысловасці, АПК, аховы здароўя і адукацыі. «І гэта не проста лічбы, а будучыня нашай эканомікі, сельскай гаспадаркі і сацыяльнай сферы», — падкрэсліў губернатар.

Сярод тых, хто стаў «Маладым лідарам Міншчыны» і атрымаў кнігу «Наш Прэзідэнт» з рук старшыні аблвыканкама, — **спецыяліст па сацыяльнай рабоце Капыльскага ТЦСАН Наталля АРЦЮШЭЎСКАЯ.** Дзяўчына рэалізоўвае ў тэрытарыяльным цэнтры праект «Жыццё на кончыках пальцаў». «Працуем з людзьмі сталага ўзросту, інвалідамі з цяжкімі і шматлікімі парушэннямі здароўя. Праводзім мерапрыемствы па аднаўленні рухомасці верхніх канечнасцяў. Для гэтага выкарыстоўваем методыку, якая развівае дробную маторыку пальцаў, прычым практыкаванні можна рабіць і ў хатніх умовах. Сацыяльныя работнікі, сядзелкі і самі падапечныя праходзяць навучанне тэхналогіям такой адаптаванай фізікі».

**Старшы інструктар-ратавальнік Пухавіцкага РАНС Мікіта КРОТ** — аўтар праекта «Віртуальны горад прафесій». «Перш чым зрабіць важны выбар, які ўплывае на ўсё далейшае жыццё, маладому чалавеку варта паспрабаваць сябе ў той ці іншай прафесіі віртуальна, — расказвае ён. — Такое паглыбленне ў інтэрактыўны свет прафесій і атрыманне практыкі работы ў розных сферах — гэта магчымасць зразумець, адчуць прафесію знутры. І, як вынік, зрабіць правільны, усвядомлены выбар».

**Малады спецыяліст, настаўніца англійскай мовы Сёмкаўскай сярэдняй школы Мінскага раёна Марыя БАРАНАВА** распрацавала праект «Лічбавыя тэхналогіі ў інклюзіўным адукацыйным працэсе». «У нашай установе навучаюцца дзеткі з асаблівасцямі развіцця. Многія не могуць пісаць, у кагосьці парушана маўленне. Я знайшла шмат карысных платформ, дзе рэальна ствараць гульні, мультфільмы, якія дазваляюць карэкціраваць артыкуляцыю, вымаўленне. Прычым гэта можа зрабіць кожны, у тым ліку бацькі», — патлумачыла яна.

Усяго дыпломы пераможцаў абласнога конкурсу «Малады лідар Міншчыны» атрымалі 14 чалавек.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**
*г. Мар'іна Горка.*


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Слонимский агросервис», 231800, Гродненская обл., г. Слоним, ул. Строителей, 8. УНП 500057736 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов (одним лотом). Месторасположение – Гродненская обл., Слонимский р-н, д. Чемеры, ул. Грибовская и Озгиновичский с/с, 27, вблизи д. Чемеры**

**Производственная база** в составе:
**гаражи** (инв. № 450/С-14806 – 404 кв. м и инв. № 450/С-14814 – 396,8 кв. м), **административное здание** (инв. № 450/С-12729, 467,2 кв. м, составные части: двое ворот, забор, два покрытия), **здания нежилые** (инв. № 450/С-14624 – 518,4 кв. м и инв. № 450/С-14772 – 363 кв. м), **контрольно-диспетчерский пункт** (инв. № 450/С-12762, 359,5 кв. м, составные части: навес). **Обременение:** помещения зданий частично сданы в аренду

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 233 640,00 бел. руб.**
Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота

***Сведения о земельных участках:***
1 – общ. пл. 0,6852 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений;
2 – общ. пл. 0,3534 га, предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания административного здания. Ограничения (обременения) прав на земельные участки: расположены в водоохранных зонах рек и водоемов

**Задаток 10 %** от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 15 (пятнадцать) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**
Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **4 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.03.2025

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 18.07.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов.
**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 17.07.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |



Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 2, УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Гипросвязь», г. Минск, ул. Сурганова, 24, ком. 219. УНН 100230534 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронных торгов**
**Легковой специальный универсал SKODA YETI,**
9146 HI-7, 2013 г. в.
Месторасположение: г. Минск, ул. Сурганова, д. 24

**Начальная цена с НДС – 18 360,00 бел. руб.** (снижена на 27 %)
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **10 (десяти) рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **6 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 09.01.2025

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 30.06.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 27.06.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**

## О реализации имущества СООО «МЯСОПРОДУКТ»

Повторные торги по реализации имущества ООО «МЯСОПРОДУКТ» (1 лот), проведенные **10.06.2025 в 12.00** признаны несостоявшимися по причине отсутствия заявок

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | ООО «АсистБанкрот», УНП 693326101, тел. +37544 7945248 |
| **Продавец** | СООО «МЯСОПРОДУКТ», УНП 800016744, тел. +375333070212 |
| **Форма, дата, время и место проведения торгов** | Повторные торги в форме открытого аукциона **02.07.2025 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6/1-9, оф. 301 |

**Сведения о предмете проведения торгов**

**Лот № 1 (все одним лотом):**
- капитальное строение (наименование – Здание мясоколбасного цеха) с инвентарным номером 622/С-20986, состоящее из недвижимых улучшений (здание мясоколбасного цеха А1/п с пристройками 1–12, 22, 23, 25, 26, 28–30, холодильными камерами 13–18, навесами 19, 24, 27, складом № 1 20, складом № 2 21, крыльцами б и в, дымовой трубой а) общей площадью здания 1596,1 м², расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625481704116000002, по адресу: Минская область, Столбцовский район, Старосверженский с/с, 6, район д. Скоморошки;
- капитальное строение (наименование – здание группы оформления документов) с инвентарным номером 622/С-40413, состоящее из недвижимых улучшений (Здание группы оформления документов В1/м с пристройкой 1 и крыльцом) общей площадью здания 36,8 м², расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625481704116000002, по адресу: Минская область, Столбцовский район, Старосверженский с/с, д. Скоморошки, ул. Восточная, 15/2;
| 2003 | Промо-тумба 1600*1150*1000, лДСП 18 мм, белый, инв. № 00000645 | 66,96 | 6,70 | 3,35 |
| 2004 | Промо-тумба 2200*1800*450, лДСП 18 мм, белый, инв. № 00000644 | 160,92 | 16,09 | 8,05 |
| 2005 | Противокражная система, инв. № 00000632 | 122,04 | 12,20 | 6,10 |
| 2006 | Световой короб интерьерный тканевый 1400х1200х100, инв. № 00000663 | 88,56 | 8,86 | 4,43 |
| 2007 | Стеновая панель в зоне кассы, лДСП 18мм, белый, наклеено полотно из меха, по торцам подсветка, инв. № 00000656 | 149,04 | 14,90 | 7,45 |
| 2008 | Стойка с оргстеклом, ИмпАрт, инв. № 00000679 | 54,00 | 5,40 | 2,70 |
| 2009 | Тумба-стойка для аксессуаров 2700*1200, лДСП 18 мм, инв. № 00000642 | 214,56 | 21,46 | 10,73 |
| 2010 | Тумба-стойка для одежды 2700*1200, лДСП 18 мм, инв. № 00000643 | 169,20 | 16,92 | 8,46 |
| 2011 | ilo port для сетевого оборудования, инв. №: 00000567 | 19,41 | 1,94 | 0,97 |
| 2012 | Бесконтактный POS-терминал PAX A910 4G WiFi fiscal version, ПО «INPAS SOFT Unipos Droid», инв. №: 00000618 | 41,40 | 4,14 | 2,07 |
| 2013 | Беспроводная точка доступа HP E-MSM430, инв. №: 00000478 | 61,47 | 6,15 | 3,07 |
| 2014 | Беспроводная точка доступа WANFAR-221E-E, инв. №: 00000521 | 98,94 | 9,89 | 4,95 |
| 2015 | Беспроводная точка доступа Wi-fi Fortinet Indoor, инв. №: 00000566 | 43,50 | 4,35 | 2,18 |
| 2016 | Беспроводной сканер штрих-кода Mertech CL-610 BLE P2D USB черный, инв. №: 00000670 | 75,48 | 7,55 | 3,77 |
| 2017 | Вывеска на входной группе 2700х500х100, инв. №: 00000634 | 111,76 | 11,18 | 5,59 |
| 2019 | Инжектор для беспров.точки доступа 3*LANOOOGPI-115, инв. №: 00000523 | 15,21 | 1,52 | 0,76 |
| 2020 | Источник бесперебойного питания SRT1500RMXLI-NC, Филиппины, инв. №: 00000576 | 1 344,24 | 134,42 | 67,21 |
| 2021 | Касса КСА Миника-НТС 1102Ф, № 0035316, 2016 г., инв. №: 00000508 | 10,98 | 1,10 | 0,55 |
| 2022 | Коммутатор и патчкорд, инв. №: 00000303 | 6,66 | 0,67 | 0,33 |
| 2023 | Межсетевой экран INTEGRA GROUP WANFG50EBDL3Y, инв. №: 00000520 | 111,75 | 11,18 | 5,59 |
| 2024 | Межсетевой экран INTEGRA GROUP WANFG81EBDL3Y, инв. №: 00000522 | 304,40 | 30,44 | 15,22 |
| 2025 | Модуль-считыватель для подсчета посетителей, инв. №: 00000633 | 147,96 | 14,80 | 7,40 |
| 2026 | Монитор VIEWSONIC VA2046M, инв. №: 00000344 | 7,20 | 0,72 | 0,36 |
| 2054 | Платеж. мобил. терминал WIL220, зав. № 17275WL26694793, инв. №: 00000504 | 47,16 | 4,72 | 2,36 |
| 2055 | Платеж. мобил. терминал WIL220, зав. № 17276WL26698994, инв. №: 00000506 | 47,16 | 4,72 | 2,36 |
| 2056 | Платежный электронный мобильный терминал IWL221, инв. №: 00000418 | 52,92 | 5,29 | 2,65 |
| 2059 | Этикет-пистолет Apli однострочный, 8 знаков_1, инв. №: 00000686 | 7,20 | 0,72 | 0,36 |
| 2060 | Этикет-пистолет Apli однострочный, 8 знаков_2, инв. №: 00000687 | 7,20 | 0,72 | 0,36 |
| 2061 | IP-Видеокамера 2Мп, TR-D8121IR2 v4 2,8 миниатюрная вандалозащищенная | 33,12 | 3,31 | 1,66 |
| 2062 | Калькулятор наст.12р GR-12 Casio темно-зеленый 35*155*209 мм | 4,68 | 0,47 | 0,23 |
| 2063 | Коммутатор Gigabit Smart Switch with 48 10/100/1000Base-T | 31,68 | 3,17 | 1,58 |
| 2064 | КСА Элвес-МК № 70000563 | 19,44 | 1,94 | 0,97 |
| 2067 | КСА Элвес-МК № 70000566 | 19,44 | 1,94 | 0,97 |
| 2068 | КСА Элвес-МК № 70000569 | 19,44 | 1,94 | 0,97 |
| 2069 | КСА Элвес-МК № 70000570 | 19,44 | 1,94 | 0,97 |
| 2070 | Платежный терминал, инв. № 87715 | 53,64 | 5,36 | 2,68 |
| 2071 | Терминал, инв. № П15_7538 | 53,64 | 5,36 | 2,68 |

В отношении лотов проводятся четвертые повторные торги.
**Стоимость снижена на 50 % в отношении лота № 1994.**
**Стоимость снижена на 70 % в отношении лотов №№ 1995–2017, 2019–2026, 2054–2056, 2059–2064, 2067–2071.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» от 27.05.2025

**Местонахождение лотов №№ 1995–2010:** г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 1.
**Местонахождение лотов №№ 2011–2017, 2019–2026, 2054–2056, 2059–2064, 2067–2071:** г. Минск, ул. Тростенецкая, д. 5, каб. 222.
**Местонахождение лота № 1994:** г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 1; г. Минск, ул. Тростенецкая, д. 5, каб. 222

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **30 июня 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 17 июня 2025 года до 16.00 26 июня 2025 года |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ООО «Орбико Салон Профешнл», проводимых 30.06.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.

**Вознаграждение аукциониста: по лотам №№ 1994, 1995, 2020 – 9 %, по лотам №№ 1996-2017, 2019, 2021–2026, 2054–2056, 2059–2064, 2067–2071 – 10 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра **лотов №№ 1995-2010 – Андрей +375293042560 (с 10.00 до 18.00 пн–пт), лотов №№ 1994, 2011–2017, 2019–2026, 2054–2056, 2059–2064, 2067–2071 – Александра +375298717536 (с 9.00 до 17.00 пн-пт).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ООО «Орбико Салон Профешнл» в лице ликвидатора – ООО «Капитал Диалог», тел. +375291308530 (220020, г. Минск, пр-т Победителей, д. 100, оф. 403, УНП 193087090)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

# АБМЕН НАПАДАМІ

## Ізраіль напаў на Іран, у адказ Тэгеран запусціў ракеты. Што адбываецца на Блізкім Усходзе?



**Ізраіль у ноч на 13 чэрвеня нанёс авіяўдары па Іране. Выбухі прагрымелі ў Тэгеране, Харэмабадзе, Хамадане, таксама быў атакаваны ядзерны аб'ект у Натанзе. У Мінабароны Ізраіля назвалі ўдар па Іране прэвентыўным. Крокі ў адказ з боку Тэгерана не прымусілі сябе доўга чакаць: у бок Ізраіля паляцелі ракеты, праравашы знакамітую абарону СПА — «Жалезны купал» аказаўся не такім ужо і жалезным.**

Напад на Іран ізраільскія ўлады патлумачылі асцярогамі ў сувязі з ядзернай праграмай Тэгерана. Прэм'ер-міністр Біньямін Нетаньяху заявіў, што мэта аперацыі — ліквідаваць пагрозу, якую Іран нясе самому выжыванню Ізраіля.

У сваю чаргу вярхоўны лідар Ірана аятала Алі Хаменеі ў сваім пасланні грамадзянам краіны назваў злачынствам удары Ізраіля па Іране і заявіў, што Ізраіль чакае «горкі і жахлівы лёс». Як паведаміў корпус вартавых ісламскай рэвалюцыі Ірана (КВІР), Ісламская Рэспубліка ў адказ на ўдары Ізраіля пачала аперацыю «Праўдзівае абяцанне 3» па ваенных цэлях у Ізраілі. Праўда, дасталося не толькі вайскоўцам.

Аб'екты энергетычнай інфраструктуры сталі мэтай ракетнага ўдару Ірана па тэрыторыі Ізраіля, паведаміла іранскае агенцтва Fars.

Fars адзначае, што «высокадакладныя ракеты паразілі ключавыя ізраільскія энергетычныя аб'екты». Ракетны ўдар выклікаў перабоі ў працы сістэмы электразабеспячэння ў цэнтральных раёнах Ізраіля, а таксама вывеў са строю частку крытычна важнай інфраструктуры.

Энергетычным аб'ектам Ісламскай Рэспублікі таксама «прыляцела» ў адказ, на што Іран адрэагаваў атакамі па нафтаперапрацоўчым заводзе ў Хайфе, аб чым паведаміла іранскае дзяржаўнае тэлебачанне.

Ізраіль таксама ў даўгу не застаўся, нанёсшы ўдары па двух нафтасховішчах у Тэгеране, — на абодвух аб'ектах узнік пажар. Пра гэта паведамілі іранскія агенцтвы Fars і Tasnim. У прыватнасці, атацы падвергліся нафтасховішчы ў раёнах Кан і Шахран.

Армія абароны Ізраіля (ЦАХАЛ) заявіла таксама, што ізраільскія ВПС пачалі наносіць удары па ваенных аб'ектах у Тэгеране.

«ВПС Ізраіля цяпер наносяць удары па вайсковых цэлях у Тэгеране», — агучылі даныя ізраільскія вайскоўцы 15 чэрвеня. Яны дадалі, што паралельна ізраільская армія вядзе дзейнасць па перахопе ракет, запушчаных з Ірана па ізраільскай тэрыторыі.

Акрамя таго, Ізраіль прасіў Адміністрацыю прэзідэнта ЗША Дональда Трампа далучыцца да канфлікту з Іранам для знішчэння ядзернай праграмы Тэгерана. Пра гэта інфармуе амерыканскі партал Axios, які арыентаваны на даныя двух ізраільскіх чыноўнікаў.

Крыніца партала не выключае, што Штаты могуць далучыцца да аперацыі, бо, паводле яго слоў, амерыканскі лідар у нядаўняй гутарцы з прэм'ер-міністрам Ізраіля Біньямінам Нетаньяху намякаў, што пры неабходнасці зробіць гэта.

Паводле паведамлення ізраільскай крыніцы партала Axios, у Амерыцы таксама разглядаюць просьбу блізкаўсходняй краіны далучыцца да супрацьстаяння з Іранам, а ізраільскія ўлады спадзяюцца на згоду.

> **З боку ЗША парталу пацвердзілі атрыманы адміністрацыяй Дональда Трампа заклік ад Ізраіля далучыцца да канфлікту. Пры гэтым прадстаўнік Штатаў пазначыў, што гэты варыянт у адміністрацыі не разглядаюць.**

На брыфінгу ў нядзелю афіцыйны прадстаўнік арміі Ізраіля Эфі Дэфрын заявіў, што ізраільскія вайскоўцы атакавалі ў Іране ўжо больш за 250 цэляў і працягваюць наносіць удары.

Паводле яго слоў, былі атакаваныя больш за 250 цэляў, звыш 720 кампанентаў ваеннай інфраструктуры. «І ў гэтыя гадзіны мы працягваем атакаваць дзясяткі аб'ектаў у Тэгеране», — паведаміў ён.

Разам з тым у ноч на 15 чэрвеня ЦАХАЛ зафіксаваў запуск 60 ракет і БПЛА з Ірана і Емена. Эфі Дэфрын адзначыў, што атака была адначасовай. Гэта ракеты класа «зямля — зямля» і дзясяткі беспілотнікаў. «Яны былі выпушчаныя наўпрост з тэрыторыі Ірана і Емена ў напрамку гарадоў і пасёлкаў у ізраільскім тыле», — пазначыў ён.

У сваю чаргу Іран назваў умову, пры якой гатовы спыніць агонь, — калі Ізраіль спыніць сваю агрэсію. Такую заяву зрабіў кіраўнік МЗС Ісламскай Рэспублікі Абас Арагчы. На сустрэчы з замежнымі дыпламатамі ў Тэгеране афіцыйны прадстаўнік падкрэсліў, што абарона з боку дзяржавы «цалкам легітымная і ажыццяўляецца з пазіцыі сілы». «Калі агрэсія спыніцца, натуральна, спыняцца і нашы дзеянні ў адказ», — запэўніў ён.

**По матэрыялах БелТА і ТАСС.**

### Кампетэнтна

### Парламентарый: «Недапушчальна, што ў рамках эскалацыі гінуць мірныя людзі, жанчыны, дзеці»

Беларускія парламентарыі сур'ёзна занепакоеныя новым ваенным вітком эскалацыі паміж Ізраілем і Іранам. Пра гэта заявіў **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Сяргей РАЧКОЎ.**

У прыватнасці, парламентарый асабліва падкрэсліў:

— Недапушчальна, што ў рамках гэтай эскалацыі гінуць мірныя людзі, жанчыны, дзеці. Міжнародная супольнасць даўно аказвае садзейнічанне дзвюм краінам у наладжванні адносін, у вырашэнні наяўных праблем мірнымі сродкамі. Сілавога вырашэння праблем паміж Ізраілем і Іранам, у цэлым ваенна-палітычнай сітуацыі на Блізкім Усходзе, не існуе.

Ён выказаў упэўненасць, што такая эскалацыя, наадварот, перашкаджае рабоце міжнародных механізмаў, у тым ліку і парламенцкіх, — па ўрэгуляванні канфліктаў, наладжванні адносін паміж дзвюма краінамі.

На думку парламентарыя, неабходна ў гэтых умовах праяўляць максімальную стрыманасць і думаць пра тое, як, якімі спосабамі і шляхамі працягнуць перамоўны працэс, у тым ліку па ядзернай праграме Ірана.

Сяргей Рачкоў агучыў сур'ёзную занепакоенасць беларускіх парламентарыяў новым ваенным вітком эскалацыі паміж Ізраілем і Іранам:

— Мы занепакоеныя тым, што бакі не знаходзяць згоды і не бачаць магчымасці ўрэгулявання гэтай праблемы менавіта палітыка-дыпламатычнымі сродкамі. І тут важна яшчэ раз адзначыць, што іншых магчымасцяў і механізмаў, акрамя палітыка-дыпламатычнага ўрэгулявання, не існуе.

На заканчэнне Сяргей Рачкоў адзначыў:

— Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі падтрымлівае намаганні па ўрэгуляванні гэтага канфлікту, па пошуку мірных шляхоў яго вырашэння.


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА в г. Марьина Горка, ул. Андреевская, 16А, Пуховичского района

**Организатор электронных торгов:** Пуховичский районный исполнительный комитет, Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, тел.: (801713) 35645, 35427; 8 (033) 9029538.
**Оператор электронной торговой площадки:** открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа»
**Электронный адрес электронной торговой площадки:** www.et.butb.by. Дата проведения электронных торгов: **17 июля 2025 г.**
**Время проведения электронных торгов** устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер; целевое назначение земельного участка; вид права | Площадь земельного участка, *га* | Инженерная инфраструктура (возможность подключения) | Начальная цена, *руб.* | Задаток, *руб.* | Расходы по подготовке, *руб.* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. Андреевская, 16А** | 624450100001004342, строительство и обслуживание центра по оказанию ветеринарных услуг; аренда сроком на 25 лет | 0,0366 | Сети электроснабжения, электросвязи | 1 544,98 | 154,49 | 3 819,02+ стоимость объявления в СМИ и ЭТП |

**Задаток** для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Срок внесения задатка –** до подачи заявления на участие в электронных торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в торгах. **Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах** с прилагаемыми к ним документами – **14 июля 2025 года до 15.00.**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник–пятница, 8.30–13.00, 14.00–17.30).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143.

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан:

возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов;

возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией прав в отношении земельного участка;

внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) за земельный участок, продаваемый в частную собственность.

После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола, а также заключает с ним договор аренды земельного участка – в случае проведения электронных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков.

# НЕ ЎСЁ СПАКОЙНА Ў АМЕРЫКАНСКІМ КАРАЛЕЎСТВЕ

## Майдана ў Лос-Анджэлесе не будзе, але званочкі трывожныя

**Масавыя беспарадкі ў Лос-Анджэлесе сталі найважнейшай міжнароднай навіной. Палаючыя аўтамабілі, звар'яцелы натоўп, пагромы, марадзёрства, супрацьстаянне сіл правапарадку і маніфестантаў — усё гэта сучасная рэальнасць для «самай дэмакратычнай» краіны свету. Рухаючай сілай усяго гэтага дзейства сталі нелегальныя мігранты, а месцам — найбагацейшы горад Каліфорніі з амаль чатырохмільённым насельніцтвам.**

Адно з перадвыбарных абяцанняў прэзідэнта ЗША Дональда Трампа заключалася ў «вырашэнні праблемы незаконнай міграцыі». Увогуле добрае распачынанне, паколькі незаконныя мігранты ствараюць сацыяльную напружанасць, фарміруюць крымінальнае асяроддзе і руйнуюць дзяржаўныя асновы. Па ацэнках Інстытута міграцыйнай палітыкі, на дадзены момант у ЗША пражываюць каля 10,5 млн нелегальных імігрантаў, якія сталі «схаваным» рэзервам Дэмакратычнай партыі. Падобна, што менавіта міжпартыйныя разборкі ляжаць у аснове цяперашніх падзей. Дэмакраты, якія прайгралі прэзідэнцкія выбары, прыступілі да падрыхтоўкі рэваншу, а эмігранты разглядаюцца ў якасці сродку ціску на адміністрацыю Трампа. Аднак аб усім па парадку.

### ХРОНІКА ПАДЗЕЙ

6 чэрвеня ў прыгарадзе Лос-Анджэлеса ўспыхнулі вулічныя беспарадкі з-за рэйдаў іміграцыйнай і мытнай паліцыі. Спачатку пратэстоўцы перакрывалі дарогі і выходзілі на вуліцы са сцягамі Мексікі, аднак затым мірныя выступленні перараслі ў сутычкі з паліцыяй. Больш за тое, мэр Лос-Анджэлеса Карэн Бас увечары гэтага ж дня практычна падтрымала пратэстоўцаў, заклікаўшы грамадскасць «мабілізавацца супраць федэральных службаў». У ноч з пятніцы на суботу па ўсім горадзе былі расстаўленыя сотні паддонаў з камянямі, а дзеянні «натоўпу» набылі выразна кіраваны характар.

Выступаючы перад вайскоўцамі на базе Форт-Брэг у штаце Паўночная Караліна, Трамп заявіў, што пратэсты ў Каліфорніі «кімсьці» аплачваюцца і ён мае намер даведацца праз генеральнага пракурора ЗША Пэма Бондзі і міністэрства юстыцыі, «хто фінансуе ўсё гэта».

На думку амерыканскага лідара, тыя масавыя беспарадкі і пратэсты, якія прайшлі ў Каліфорніі, — гэта «поўнамаштабны напад на мір», грамадскі парадак і нацыянальны суверэнітэт Злучаных Штатаў, «што ажыццяўляецца мяцежнікамі, якія нясуць замежныя сцягі», з мэтай працягу ўварвання на амерыканскую тэрыторыю. Вось так, не больш і не менш.

### «КАЛЯРОВЫЯ» ТЭХНАЛОГІІ ПРАЦУЮЦЬ І Ў АМЕРЫЦЫ

У старым анекдоце на пытанне: «Ці можа адбыцца «каляровая рэвалюцыя ў ЗША?» даваўся адназначны адказ: «Не, таму што там няма амерыканскага пасольства». Сёння гэтая некалі бясспрэчная ісціна ўжо такой не з'яўляецца. Распрацаваная Вашынгтонам і апрабаваная ў розных кутках свету тэхналогія паспяхова прымяняецца на амерыканскай зямлі.

Базавыя прынцыпы «каляровай рэвалюцыі» ўпершыню былі зафіксаваны ў дакументах ЦРУ ЗША ў 1949 годзе: «каардынацыя і выкарыстанне ўсіх сродкаў, уключаючы маральныя і фізічныя (выключаючы ваенныя аперацыі рэгулярнай арміі, але выкарыстоўваючы іх псіхалагічныя вынікі), пры дапамозе якіх знішчаецца воля ворага да перамогі, падрываюцца яго палітычныя і эканамічныя магчымасці». Адным з галоўных тэарэтыкаў «крытычнасці» лічыцца амерыканец Стывен Ман, аўтар ідэі аб неабходнасці «стварэння хаосу» як інструмента забеспячэння нацыянальных інтарэсаў ЗША.

Па змесце яна з'яўляецца інфармацыйнай аперацыяй, якая праводзіцца з выкарыстаннем некласічных метадаў барацьбы («негвалтоўных метадаў супраціву») з мэтай змены кансерватыўнага палітычнага рэжыму на яго лаяльны аналаг з адначасовым пазбаўленнем эліты і народа магчымасці самастойна вызначаць шляхі развіцця дзяржавы.



У дачыненні да ЗША і падзей у Лос-Анджэлесе гаворка не ідзе ні пра якія рэвалюцыі. Амерыканскае грамадства рэальна раскалатае ў частцы, якая тычыцца далейшага развіцця краіны. Міжпартыйныя разборкі паміж рэспубліканцамі і дэмакратамі — гэта толькі знешняе адлюстраванне супярэчнасцяў у дзяржаўных элітах. Пры гэтым бакі дэманструюць гатоўнасць задзейнічаць увесь існуючы інструментарый для адстойвання ўласнай пазіцыі. Сярод гэтага пераліку і сродкі «каляровых» рэвалюцый: вулічныя пратэсты, сутыкненні з сіламі правапарадку, марадзёрства, разбой, акцыі грамадзянскага непадпарадкавання, інфармацыйная і фінансавая падтрымка пратэстоўцаў.

Не выклікае сумневу, што пратэсты ў Каліфорніі не носяць спантаннага характару, а абарона правоў мігрантаў — гэта не больш, чым нагода ацаніць гатоўнасць Трампа адстойваць уласныя пазіцыі. Да крызісу ў Лос-Анджэлесе маюць дачыненне цэлы шэраг ліберальных, некамерцыйных, няўрадавых амерыканскіх арганізацый, многія з якіх звязаны з Дэмакратычнай партыяй і атрымлівалі фінансаванне ў перыяд прэзідэнцтва Байдэна. Усе гэтыя сілы аб'ядноўваюцца ў рамках руху «No kings» («Без каралёў»), што, відавочна, з'яўляецца намёкам на Трампа і яго ўладу. Ва ўсім працэсе ёсць прыкметы вельмі добрай арганізацыі як з пункту гледжання рыторыкі, лозунгаў і сімволікі, так і з пункту забеспячэння, а пратэстоўцаў фактычна падтрымлівае мясцовая ўлада.

Па сутнасці, на тэрыторыі ЗША рэалізоўваюцца элементы «каляровай» рэвалюцыі без знешняга ўздзеяння. Гэтыя падзеі з'яўляюцца вынікам глыбокага расколу ўнутры амерыканскага грамадства і палітычнай эліты. Яны пагаршаюцца працэсам страты Вашынгтонам сваёй дамінантнай пазіцыі ў свеце і фарміраваннем новай геапалітычнай рэальнасці. Казаць аб тым, што Лос-Анджэлес стане трыгерам агульнаамерыканскага «майдана» не варта, аднак можна ўпэўнена сцвярджаць, што ў Амерыканскім каралеўстве не ўсё ў парадку.

Амерыка сёння — гэта ніякім чынам не эталон дэмакратыі, а хутчэй імперыя, якая завяршае свой жыццёвы цыкл. Як будуць развівацца падзеі — пакажа час, нам пры гэтым застаецца толькі назіраць, цаніць уласную стабільнасць і рабіць высновы ў інтарэсах забеспячэння ўласнай нацыянальнай бяспекі.

**Мікалай БУЗІН,**
**старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў, доктар ваенных навук, прафесар.**

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 15 июля 2025 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб. | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Ларисы Ляшенко, 37 микрорайон «Заболоть», У-408 440100000002007297** | 0,0940 | Не завершенное незаконсервированное капитальное строение, площадь застройки: 104 кв. м, готовность 7 %. Фундамент: бетонные сваи, монолитный ленточный бетонный ростверк | 31 133,55 (4 719,55; 26 414,00) | 243,04 | 6 200,00 |

Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок с момента подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома в установленный срок. Победитель аукциона обязан в течение срока строительства возместить затраты на инженерную и транспортную инфраструктуру согласно индивидуально разработанному проекту в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 и решением Гродненского городского исполнительного комитета от 03.04.2025 № 249.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефоны: +375 (152) 626055, 626056.

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа 40901, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Аукцион состоится 15 июля 2025 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

**Прием документов, консультации и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 20 июня по 9 июля 2025 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

СПОРТ-ТАЙМ

# ЦІ БУДЗЕ ВЫНІК АД СПАРТЫЎНАЙ ДЫПЛАМАТЫІ?

## Прадстаўнік НАК Беларусі прыняў удзел у міжнародным форуме атлетаў

**Размовы аб міжнароднай ізаляцыі беларускага спорту ўсё яшчэ застаюцца актуальнымі. І гэта сумна. Але паступова несправядлівыя і недарэчныя санкцыі з нашага спорту здымаюцца. І гэта добра.**

На мінулым тыдні намеснік старшыні камісіі спартсменаў Нацыянальнага алімпійскага камітэта Сяргей РУТЭНКА ўзяў удзел у XXII Міжнародным форуме атлетаў, які прайшоў у Лазане. Сёлета форум аб'яднаў больш за 400 атлетаў і даў магчымасць абмеркаваць самыя актуальныя спартыўныя пытанні. Няцяжка здагадацца, якое з іх для беларускіх спартсменаў самае актуальнае.

Абмяркоўвалі аднаўленне ў правах не толькі беларускіх спартсменаў, але і федэрацый па відах спорту, многія з якіх сёння не могуць прымаць паўнаважасны ўдзел у міжнародным спартыўным жыцці.

«Адхіленне нашых федэрацый, да прыкладу, тэніса, а таксама па гульнявых відах спорту (хакея, гандбола) наносіць шкоду развіццю сусветнага алімпійскага руху і алімпійскіх рэйтынгавыя ачкі. З боку Камісіі атлетаў і МАК адзначаецца разуменне сітуацыі, якая склалася, і непазбежнай неабходнасці змяняць яе ў хуткім часе. Пры гэтым удзел беларускіх атлетаў у Еўрапейскім юнацкім алімпійскім фестывалі разглядаецца як адзін з важных крокаў да паступовага поўнага вяртання спартсменаў на міжнародныя турніры», — адзначыў Сяргей Рутэнка ў каментарыі для прэс-службы НАК Беларусі.




На палях форуму Сяргей Рутэнка правёў перагаворы з прадстаўнікамі Камісіі атлетаў Міжнароднага алімпійскага камітэта, яе старшынёй Эмай Тэрхо і дырэктарам дэпартамента па сувязях з НАК Міжнароднага алімпійскага камітэта Джэймсам Маклеодам.

відаў спорту, бо стварае праблемы для падрыхтоўкі спартсменаў. Асабліва гэта датычыцца юных атлетаў. Федэрацыі пазбаўленыя права праводзіць рэйтынгавыя турніры — як вынік, маладым спартсменам не хапае матывацыі — няма магчымасці набіраць

А тым часам спартыўны дырэктар МАК Кіт Маконэл ад імя Міжнароднага алімпійскага камітэта падзякаваў спартыўным федэрацыям за допуск беларускіх і расійскіх атлетаў на спаборніцтвы ў нейтральным статусе, паведамляе ТАСС. «Пазіцыя МАК дакладная, яна была паслядоўнай цягам усяго часу — у спартсменаў у адпаведнасці з нейтральным пратаколам павінна быць магчымасць спаборнічаць разам з калегамі з іншых краін», — заявіў ён на Генеральнай Асамблеі Асацыяцыі летніх Алімпійскіх міжнародных федэрацый (ASOIF) у Жэневе.

Аднак далёка не ўсе спартыўныя федэрацыі падзяляюць «дакладную і паслядоўную» пазіцыю МАК па допуску нашых спартсменаў. Напрыклад, да зімовых Алімпійскіх гульняў 2026 года нашых атлетаў дапусціў толькі Міжнародны саюз канькабежцаў, і тое з вялікай колькасцю абмежаванняў і без лідараў каманды. А паколькі перыяд адхілення навучыў не страчваць надзею, сёння ўсе чакаюць пазітыўных перамен ад новага кіраўніка Міжнароднага алімпійскага камітэта Кірсці Ковентры, якая хутка афіцыйна заступае на пасаду.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота НАК Беларусі.**

НАДВОР'Е

# НЕПАГАДЗЬ ЗАРАДЗІЦЬ АМАЛЬ НА ТЫДЗЕНЬ

## Месцамі чакаюцца навальніцы і моцны парывісты вецер

**Перадапошні тыдзень чэрвеня будзе пад уплывам вільготных франтоў з Балтыйскага мора, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, днём месцамі з навальніцамі. Вецер уначы пераменных напрамкаў, удзень паўночна-заходні парывісты, уначы месцамі на захадзе, удзень у асобных раёнах моцны парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ноччу ад 10 °С да 16 °С, максімальная днём складзе — 18-24 °С.

У сераду ноччу месцамі па паўночным усходзе, днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Днём у асобных раёнах чакаюцца навальніцы. Вецер заходняй чвэрці ўмераны, удзень парывісты, пры навальніцах моцны парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ноччу ад 7 °С да 13 °С, а максімальная днём складзе ад 17 °С па поўначы да 26 °С па паўднёвым захадзе Беларусі.

У чацвер умовы надвор'я будуць вызначаць атмасферныя франты, якія ссоўваюцца з паўночнага захаду Еўропы. Воблачна з праясненнямі. Ноччу месцамі, днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Днём у асобных раёнах чакаюцца навальніцы. Вецер заходні, паўночна-заходні парывісты, уначы месцамі, удзень у многіх раёнах моцны парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ноччу будзе ад 8 °С да 14 °С, максімальная днём ад 14 °С па поўначы да 23 °С па поўдні краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**






Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

17 ЧЭРВЕНЯ Даты Падзеі Людзі

У краіне

**1910** год — нарадзіўся Ціхан Пімена віч Бумажкоў, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Палескай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны арганізаваў і ўзначаліў барацьбу жыхароў раёна супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. 3 ліпеня 1941 года камандзір партызанскага атрада «Чырвоны Кастрычнік», які разам з падраздзяленнем Чырвонай Арміі каля месяца стрымліваў наступленне гітлераўцаў на р. Пціч. 18 ліпеня 1941 года разграміў у в. Азямля штаб варожай дывізіі, знішчыў і захапіў 55 броне- і аўтамашын, 18 матацыклаў ворага. Бумажкову і яго памочніку Ф. І. Паўлоўскаму першым з савецкіх партызан 6 жніўня 1941 года прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

**1934** год — па распараджэнні кіраўніцтва Польшчы для ізаляцыі камуністаў, камсамольцаў і левых элементаў быў створаны Бяроза-Картузскі канцэнтрацыйны лагер. Размяшчаўся ў былых ваенных казармах населенага пункта Бяроза-Картузская (цяпер г. Бяроза Брэсцкай вобласці). Вызначаўся жорсткім рэжымам. З прыходам Чырвонай Арміі на тэрыторыю Заходняй Беларусі ў верасні 1939 года ліквідаваны. Сёння на тэрыторыі былога канцлагера пастаўлены помнік яго ахвярам.

У свеце

**1759** год — англійскі пірат Фрэнсіс Дрэйк падчас кругасветнага плавання высадзіўся ў раёне сённяшняга Сан-Францыска і абвясціў гэты бераг англійскім уладаннем («Новы альбіён»).

**1882** год — нарадзіўся Ігар Стравінскі, рускі кампазітар, дырыжор і піяніст, адзін з найбуйнейшых прадстаўнікоў сусветнай музычнай культуры XX стагоддзя.

**1929** год — пад загалоўкам «Кніга, пра якую не пішуць» у «Литературной газете» апублікавана рэцэнзія А. Тарасенкава на кнігу «Дванаццаць крэслаў» Ільі Ільфа і Яўгена Пятрова, якая за мінулы з моманту выдання год зусім не была заўважана ні крытыкамі, ні чытачамі.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10 936 Індэкс 63850. Зак. № 1311.

Нумар падпісаны ў 19.30 16 чэрвеня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12